

«Тэлебарометр» стаў брэндам

СТАР. 3



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ



Чыя заслуга — чысціня краіны?

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 КРАСАВІКА 2014 г. ПЯТНІЦА № 62 (27672) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Урачыста, душэўна, святочна

## ГЕРАІНІ НАШАГА ЧАСУ

**Сёння выбітным суайчынніцам будуць прысуджаны ганаровыя званні «Жанчына года»**

**Гэтыя тытулы па праве атрымліваюць жанчыны — пераможцы рэспубліканскага конкурсу, якія дасягнулі значных поспехаў у прафесіі, бізнесе, грамадскай дзейнасці, выхаванні дзяцей, зрабілі вялікі ўнёсак у адраджэнне духоўнасці і культуры нацыі, развіццё вёскі, паказалі ўзор міласэрнасці і дабрыні...**



Фота БЕЛТА.

— Вельмі радуе той факт, што ўвесь час свайго існавання гэты конкурс выклікае інтарэс у грамадстве, адкрывае новыя імёны і прыцягвае ўдзельніц з усіх абласцей краіны, — кажа **сустаршыня Беларускага саюза жанчын Антаніна МОРАВА** *(на фота)*. — Штогод мы аналізуем вынікі папярэдняга конкурсу і на ўзроўні рэспубліканскага аргкамітэта маем права пераглядаць колькасць і змест намінацый.

СТАР. 2

# КРАСАВІК — МЕСЯЦ УРАДЖАЙНЫ



Першую тону таматаў сабралі 2 красавіка агароднікі цяплічнага камбіната ААТ «Рудакова» Віцебскага раёна. Сёлета тут плануюць сабраць больш як 5 тысяч тон вітаміннай прадукцыі. <u>На здымку</u>: *агароднікі Ніна ШЧУКЛАВА, Вольга ЛАГУНОВА і Галіна МАРКЕВІЧ.*

Фота БЕЛТА.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Кірыл КАМАРОЎ, намеснік генеральнага дырэктара «Расатам»:**

*Сёння на пляцоўцы Беларускай АЭС працуюць 2,5 тыс. чалавек. Да канца года плануецца павялічыць гэтую лічбу да 3 тыс. Нам вельмі прыемна, што гэта ў асноўным працаўнікі беларускіх будаўнічых арганізацый. Каля 90% з тых, хто сёння заняты на будаўніцтве БелАЭС, — грамадзяне Беларусі. Якасць работ беларускіх арганізацый вельмі высокая. Уласна, дзякуючы гэтаму ўся «атамная» будоўля ідзе па графіку. Рэалізацыя такога маштабнага і складанага праекта, як збудаванне АЭС, патрабуе вельмі цеснай кааперацыі паміж усімі ўдзельнікамі. Тое, як паспяхова ў нас ідзе супрацоўніцтва, сведчыць, што паміж людзьмі, паміж Беларуссю і Расіяй ёсць вельмі вялікае паразуменне і давер.*

*У свеце сёння працуе 435 энергаблокаў АЭС. У стадыі будаўніцтва — 72 блокі, і гэта вельмі значная лічба. Хачу адзначыць, што толькі летась у розных краінах свету пачалі будаваць 10 новых атамных энергаблокаў.*

■ Парламенцкі дзённік

## ПРАГМАТЫЧНЫ ІНТАРЭС

**У Смалявіцкім раёне доля малога і сярэдняга бізнесу адпавядае паказчыку развітых еўрапейскіх краін**

**Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах правяла выязное пасяджэнне ў горадзе Смалявічы, прысвечанае ўдзелу малога і сярэдняга бізнесу ў фарміраванні рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў.**

### «СТАРАЕМСЯ НЕ ПЕРАШКАДЖАЦЬ. ПА МАГЧЫМАСЦІ»

— Мы выбралі Смалявічы, таму што тут сярэдні і малы бізнес робіць важкі ўклад у эканоміку раёна, — патлумачыла выбар месца для правядзення выязнога пасяджэння **старшыня Пастаяннай камісіі Людміла ДАБРЫНІНА.** — І ў гэтым заслуга не толькі геаграфічнага становішча рэгіёна, але і мясцовай улады, якая наладзіла партнёрскія адносіны з дзелавымі коламі. Важна таксама, што ў Смалявічах створаны ўмовы, дзякуючы якім прадпрымальнікі не толькі прапануюць розныя паслугі, але і займаюцца прамысловай вытворчасцю.

Кіраўніцтва Смалявіч сваю зацікаўленасць у дзелавой актыўнасці раёна тлумачылі прагматычна: калі бізнес сюды прыйдзе, то выканкаму не трэба будзе шукаць бюджэтныя грошы на добраўпарадкаванне і развіццё тэрыторыі, сацыльнай сферы, інфраструктуры.

Пашыранае пасяджэнне парламенцкай камісіі ў Смалявіцкім райвыканкаме праходзіла ў атмасферы шчырай размовы. Акрамя дэпутатаў, прадстаўнікоў Міністэрства па падатках і зборах і мясцовай улады, на ім прысутнічалі кіраўнікі і заснавальнікі 12 прыватных кампаній. **Старшыня выканкама Міхаіл ЗАГОРЦАЎ** у сваім выступленні пазбягаў выкарыстоўваць лічбы, тым не менш, адна з нешматлікіх зрабіла ўражанне на парламентарыяў: доля малога і сярэдняга бізнесу ў кансалідаваным бюджэце раёна складае 62%, што адпавядае паказчыку развітых еўрапейскіх краін.

Сярод перашкод для развіцця бізнесу кіраўнік раёна назваў складаную працэдуру атрымання спецыяльных дазволаў ад розных службаў, недахоп зямлі, манапалізацыю энергетычнай сферы і частыя змены прававога рэгулявання.

Асаблівая тэма — манапалізм энергетыкаў. Праблемы ў сувязі з гэтым тармозяць не толькі развіццё бізнесу, але і жыллёвае будаўніцтва. Людзі бяруць крэдыты, будуюць дамы, а жыць у іх не могуць з-за адсутнасці электрычнасці і ацяплення, тлумачыў старшыня выканкама. Пры гэтым каля 500 чалавек штодня прыязджае ў Смалявічы з Мінска на працу, а ўвечары з'язджае назад. Дэфіцыт рабочых рук (нягледзячы на параўнальна добрыя заробкі — каля Br7 млн у сярэднім) — вельмі актуальная для Смалявіч праблема.

Што тычыцца заканадаўства, то кіраўніцтва раёна прасіла парламентарыяў пра стабільныя, простыя, усім зразумелыя і дакладна вызначаныя «правілы гульні». «Калі правілы вызначаны, то не мяняйце іх, — рэзюмаваў свой зварот да дэпутатаў старшыня Смалявіцкага райвыканкама. — Мы стараемся не перашкаджаць прыватнаму бізнесу па меры сваёй магчымасці. Наша задача — партнёрства. Пакуль што ў нас з дзелавымі коламі не было ніякіх канфліктаў. У 98% выпадкаў — гэта нармальныя людзі, якія нармальна працуюць і добрасумленна плацяць падаткі».

### ІЛЬГОТЫ НЕ ТЫМ

**Намесніца начальніка Галоўнага ўпраўлення метадалогіі падаткаабкладання арганізацый Міністэрства па падатках і зборах Ірына ЛУФЕРЧЫК** расказала на пасяджэнні пра льготы, якія існуюць для малога і сярэдняга бізнесу ў Беларусі, у прыватнасці — на тэрыторыі малых гарадоў і ў сельскай мясцовасці. Яна параўнала падатковую палітыку нашай краіны з умовамі для бізнесу ў Казахстане і Расіі і падкрэсліла, што работа па спрашчэнні падаткаў у Беларусі не спынена.

СТАР. 2

■ Падрабязнасці

## ЯК «РЭФАРМАВАЛІ» СПАЖЫЎКААПЕРАЦЫЮ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ

**Рэарганізацыя прывяла да... пагаршэння паказчыкаў па ўсіх відах эканамічнай дзейнасці**

**Кіраўніцтва Гродзенскага аблспажыўтаварыства не робіць неабходных захадаў па выкананні даручэнняў Прэзідэнта, дадзеных 8 лютага 2013 года на агульным сходзе прадстаўнікоў рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў, патрабаванняў галіновай праграмы развіцця спажывецкай кааперацыі на 2011-2015 гады і іншых дакументаў. Такая выснова зроблена калегіяй Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці па выніках праверкі аблспажыўтаварыства. Яго работа па арганізацыі гандлёвага абслугоўвання насельніцтва прызнана нездавальняючай.**

**У пасяджэнні калегіі, якую правёў старшыня Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці Васіль Герасімаў, удзельнічалі старшыня праўлення Белкаапсаюза Валерый Іваноў, кіраўнікі структур аблвыканкама, праваахоўных і кантрольных органаў.**

### КОЛЬКАСЦЬ ПАЙШЧЫКАЎ СКАРАЦІЛАСЯЎ 17 РАЗОЎ

Гэта адбылося пасля рэарганізацыі Гродзенскага аблспажыўсаюза ў абласное спажывецкае таварыства (у 2011 годзе). Усе райспажыўтаварыствы былі скасаваны і пераўтвораны ў філіялы новай абласной структуры, але ўжо без статусу юрыдычнай асобы. Пры гэтым колькасць пайшчыкаў скарацілася са 157 тысяч (на 1 снежня 2011 г.) да 9806 чалавек (на 1 снежня 2013 г.).

СТАР. 2

■ Транспарт

## КАМПОСЦЕРЫ І ВАЛІДАТАРЫ,

**або Што трэба ведаць пра новую сістэму аплаты праезду**

**Сістэма аплаты ў сталічным транспарце — справа для ўсіх новая. На маіх вачах дзяўчына прыклала да валідатара электронны праязны, але тэрмінал кантралёра пры праверцы паказаў, што праезд не аплачаны. Жанчына-рэвізор толькі здзіўлена спытала: «Вы прыкладалі карту да валідатара?», на што дзяўчына адказала: «Так, высвецілася зялёная галачка і надпіс — «аплачана». Штрафаваць пасажырку не сталі, бо пакуль што асноўная задача рэвізораў не караць людзей, а вучыць іх карыстацца новымі тэхналогіямі на транспарце. «Звязда» паспрабавала разабрацца з новай сістэмай аплаты праезду ў грамадскім транспарце сталіцы, якая выклікала шмат спрэчак.**




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### ПЕРШЫ БЛІН

Сапраўдны «жарт» мінчане атрымалі 1 красавіка, калі, апроч павышэння кошту праезду, на змену папяровым праязным прыйшлі электронныя. Увод новай сістэмы аплаты пачаўся з канфузу: значная частка абсталявання ў грамадскім транспарце проста не спрацоўвала. «Валідатары не працуюць у палове адзінак транспарту! Спачатку наладзілі б іх як мае быць! А то даказвай пасля кантралёрам, што ты не вярблюд!» — абураліся людзі ў інтэрнэце, не ведаючы, расцэньваць гэта як няўдалы першакрасавіцкі жарт ці як недасканаласць сістэмы. Некаторыя асабліва ўзрушаныя «фарумчане» прапаноўвалі прыкладаць карткі да лбоў рэвізораў, хоць не зразумела, чым яны тут правініліся. Але «Мінсктранс», які абвясціў, што цягам месяца сістэма будзе працаваць у тэставым рэжыме, паспяшаўся супакоіць грамадзян: маўляў, праз тыдзень усё выправім. «Панікаваць мінчанам не варта. Сітуацыя звязана з пачаткам работы сістэмы на вялікай колькасці тэхнічных сродкаў і бескантактных картак. Па закону вялікіх лічбаў расце адсотак памылак. Гэты этап праходзіць любая сістэма, асабліва такая маштабная», — тлумачыў **намеснік генеральнага дырэктара «Мінсктранса» Андрэй ПАПЛЕЎКА.**

СТАР. 6

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МВФ ПАДЛІЧЫЎ СТРАТЫ РАСІЙСКАЙ ЭКАНОМІКІ І ПРЫЗНАЎ, ШТО ДАПАМОГА РАСІІ ВЫРАТАВАЛА УКРАІНУ АД КАТАСТРОФЫ



Дырэктар-распарадчык Міжнароднага валютнага фонду Крысцін Лагард мяркуе, што выкарыстаныя Захадам санкцыі ўжо аказалі негатыўнае ўздзеянне на расійскую эканоміку. «Калі паглядзець на аб'ём адтоку капіталу з Расіі ў астатнюю частку сусветнай супольнасці за апошнія пару месяцаў, калі паглядзець на рашэнне Цэнтральнага банка Расіі змяніць манетарную палітыку, то становіцца ясна, што існуюць наступствы пагроз прымянення санкцый і самога прымянення санкцый», — сказала Лагард у інтэрв'ю PBS. Кіраўнік МВФ канстатавала, што з Расіі ідзе «масавы адток» капіталаў, а гэта з'яўляецца выразным указаннем на тое, што грошы сыходзяць з краіны. Ацэньваючы сітуацыю ва Украіне, Крысцін Лагард сказала, што эканоміка краіны «рухалася ў кірунку катастрофы». Пры гэтым Лагард прызнала, што «без падтрымкі з боку Расіі, гэтага «выратавальнага круга», кінутага некалькі месяцаў таму, краіна рухалася б у нікуды». Лагард падкрэсліла, што Украіна вельмі мае патрэбу ў правядзенні цяжкіх рэформаў і сёння не мае доступу да сусветнага фінансавага рынку. Яна таксама нагадала пра тое, што крэдытныя сродкі МВФ «не даюцца дарма».



### КІТАЙСКАЯ МЕДЫЦЫНА МОЖА СТАЦЬ АФІЦЫЙНАЙ У ВЯЛІКАБРЫТАНІІ

Брытанскія чыноўнікі ад медыцыны вырашылі нестандартным чынам падысці да сістэмы аховы здароўя. Яны не выключаюць магчымасці ўключэння ў сістэму методык кітайскай медыцыны. Паводле слоў міністра аховы здароўя Джэрэмі Ханта, ён сам пераканаўся падчас паездак у Кітай у тым, што кітайская медыцына мае права на існаванне, калі даказана яе эфектыўнасць. Канчатковая мэта — змяшаць кітайскую і заходнюю медыцыну, піша The Telegraph. Пад кітайскай медыцынай маюцца на ўвазе раслінныя сродкі, акупунктура, масаж. Напрыклад, Нацыянальны інстытут здароўя і сацыяльнага забеспячэння ўжо рэкамендуе акупунктуру ў якасці сродку лячэння боляў у паясніцы.

### МУЖЧЫНЫ НЕ ЛЮБЯЦЬ МОЦНА НАФАРБАВАНЫХ ЖАНЧЫН

Даследчыкі Універсітэта Бэнгор не раяць жанчынам актыўна карыстацца касметыкай. Справа ў тым, што гэта адштурхвае мужчын, піша Business Standard. Паводле апытання, мужчыны аддаюць перавагу жанчынам з максімальна лёгкім макіяжам ці ўвогуле без яго. Псіхолаг доктар Алекс Джонс кажа, што такая выснова была зроблена на падставе аналізу рэакцыі на фотаздымкі ў сацыяльных сетках. У цэлым жа людзі нярэдка няправільна разумеюць тое, што супрацьлеглы пол лічыць прывабным. Гэта асабліва тычыцца жанчын, якія спрабуюць прывабіць мужчын. Раней навукоўцы высветлілі: 80% жанчын настолькі перажываюць з нагоды свайго знешняга выгляду, што чакаюць мінімум месяц, перш чым паўстаць перад новым партнёрам без макіяжу. 17% чакаюць два месяцы, 16% — да паўгода, 8% не адважваюцца паказацца ненафарбаванымі на працягу цэлага года, а 3% наогул ніколі не «агаляюць» твар перад мужчынам. 60% жанчын наогул не змываюць касметыку, калі кладуцца спаць разам з новым кавалерам.

ISSN 1990 - 763X

14062

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У ЯПОНІІ ЗАГАВАРЫЛІ ПРА РЭФЕРЭНДУМ НА КУРЫЛАХ

**Экс-міністр абароны Японіі Юрыко Каікэ расцаніла дзеянні Масквы ў Крыме як «бандыцкія» і выказала здагадку, што Расія вяртаецца да «неразумных імперскіх амбіцый».**

Цяпер Токіа варта лічыць «ілжывымі» абяцанні Уладзіміра Пуціна з нагоды перамоў па Курылах, мяркуе яна. Астравы Ітуруп, Кунашыр, Шыкатан і Хабамаі апынуліся пад кантролем СССР пасля Другой сусветнай вайны, нагадвае экс-міністр. Каікэ называе «дзіўнай гістарычнай іроніяй» той факт, што на спрэчных тэрыторыях жыве мноства этнічных украінцаў. «Калі б рэферэндум аб



незалежнасці адбыўся на востраве Ітруп, дзе 60% жыхароў маюць карані ва Украіне, ці прызнаў бы Пуцін вынікі гэтак жа лёгка, як у Крыме?» — задаецца пытаннем экс-міністр.

КОРАТКА

У Беларусь на пастаяннае жыхарства ў 2013 годзе прыбылі 19,4 тыс. чалавек, выбылі 7,8 тыс. чалавек. 14,7 тыс. з іх — з краін СНД.

Пытанне скарачэння тэрміну тэрміновай ваеннай службы цяпер не разглядаецца.

Нацыянальнае ўпраўленне па паветраплаванні і даследаванні касмічнай прасторы ЗША (НАСА) разрывае ўсе кантакты з расійскімі дзяржаўнымі прадстаўнікамі, за выключэннем праграмы Міжнароднай касмічнай станцыі (МКС).

Учора, 3 красавіка 2014 года, пасольства Ізраіля ў Беларусі ў поўным аб'ёме аднавіла сваю работу, перапыненую забастоўкай супрацоўнікаў ізраільскага МЗС.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.04.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9900,00 | ■ |
| Еўра | 13630,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 279,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 866,52 | ▼ |

■ Добрыя людзі

## НЕ СПАКУСІЎСЯ

**У канцы працоўнага дня кіроўца прыгараднага аўтобуса са Светлагорска знайшоў у салоне жаночую сумачку. Акрамя дакументаў і іншых рэчаў, у ёй ляжала вялікая сума грошай у еўра і доларах, а таксама 50-грамовы злітак золата. 28-гадовы супрацоўнік светлагорскага аўтапарка з каштоўнай знаходкай адразу ж звярнуўся ў міліцыю.**

Як расказалі ў прэс-службе Гомельскага абласнога УУС, тым часам пенсіянерка, уладальніца сумачкі, спахапілася, што сярод рэчаў, з якімі яны з мужам прыехалі ў вёску, няма самага каштоўнага. Жанчына была ўпэўнена, што згубіла свае скарбы на грамадскім прыпынку, дзе чакала аўтобус, каб паехаць на дачу. Яна зноў накіравалася ў горад на пошукі. Дарэчы, грошы і золата пенсіянеры наўмысна забралі з гарадской кватэры, бо ад'язджалі на ўвесь сезон.

У горадзе жанчына вымушана была напісаць заяву аб страце ў міліцыю, хоць і не вельмі верыла ў тое, што ўсё скончыцца добра. Да нечаканай радасці пенсіянеркі, сумку з усім змесцівам ёй вярнулі ў той жа дзень. Між іншым, пенсіянерка ўзгадала, што калісьці даўно ў яе жыцці здарылася падобная сітуацыя: яна сама знайшла згубленую вялікую суму грошай і вярнула яе ўладальніку. Яна адзначыла, што, напэўна, і ёй дапамог Бог, паколькі сумка трапіла ў рукі добрага чалавека.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Надвор'е

## ЦЯПЛО ВЯРТАЕЦЦА

**Сёння тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў ускрайку скандынаўскага антыцыклону, аднак месцамі, пераважна па ўсходзе пройдуць і невялікія ападкі (мокры снег і дождж). Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 3-8 цяпла, а па паўднёвым захадзе — да 10 градусаў, паведаміла рэдакцыі <u>спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА</u>.**

У суботу гэты антыцыклон пачне гаспадарыць ужо на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Стане малавоблачна, але без ападкаў. Тэмпература паветра ў ноч на суботу мінус 2-7 градусаў, месцамі — да 9 марозу. Удзень стане больш камфортна — 5-12 цяпла, а па захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей — нават да плюс 13-15. Сонечнае надвор'е захаваецца і ў нядзелю. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 да плюс 2. Удзень да нас завітае больш цёплае паветра з боку поўдня Еўропы і тэмпература павялічыцца да 10-17 цяпла, а па поўдні прыгрэе месцамі да плюс 19 градусаў. Праўда, у нядзелю стане больш ветрана, чым у суботу.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак і аўторак краіна трапіць у зону цёплых і вільготных паветраных мас.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПРАГМАТЫЧНЫ ІНТАРЭС

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У адказ і яна, і парламентарыі пачулі ад прадстаўнікоў бізнесу крытыку некаторых відаў падатковых льгот, якімі карыстаюцца не тыя, для каго гэтыя льготы ствараліся.

— Палова новых суб'ектаў гаспадарання, зарэгістраваных у Смалявіцкім раёне, — гэта «дочкі» і «ўнучкі» мінскіх кампаній, якія проста карыстаюцца льготамі, дадзенымі, у тым ліку, Дэкрэтам №6 «Аб стымуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх пасяленняў, сельскай мясцовасці», — расказаў **генеральны дырэктар ТАА «Мідывісана» Уладзімір ХАНДОЛІН.** — Калі бываю ў Мінску, бачу, колькі стала з'яўляцца пікапаў, грузавых аўтамабіляў, увезеных у Беларусь з выкарыстаннем льгот на мытныя пошліны, гэта значыць, дзяржава недаатрымала грошы. Між тым, аб'ёмы продажу МАЗа скараціліся...

Кампанія «Мідывісана» з 1992 года праектуе і вырабляе аўтамабілі-фургоны спецыяльнага прызначэння. Яе кіраўнік закрануў і праблему, якая ўзнікла з увядзеннем у Беларусі ўтылізацыйнага збору. Па словах Уладзіміра Хандоліна, у выніку ўвядзення збору канкурэнтаздольнасць беларускіх аўтамабіляў знізілася (збор павысіў іх кошт ад 5 да 25 тысяч долараў), што ў сваю чаргу негатыўна адбілася на экспарце. Кіраўнік прыватнага прадпрыемства падзякаваў уладам Смалявіцкага раёна за дапамогу з унясеннем «Мідывісаны» ў рэестр арганізацый, якія прынялі на сябе абавязацельствы па ўтылізацыі аўтамабіляў. «Без гэтай падтрымкі яшчэ прынамсі месяц мы не змаглі б ні прадаваць аўтатэхніку, ні заключаць новыя дагаворы», — сказаў ён.

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Людміла Дабрыніна прапанавала гендырэктару прыватнага машынабудаўнічага прадпрыемства прадставіць свае прапановы па ўпарадкаванні падатковых ільгот у кансультацыйны савет пры Міністэрстве па падатках і зборах, у які ўваходзяць і парламентарыі. «Думаю, многія льготы будуць перагледжаны, — сказала Людміла Дабрыніна. — Прадстаўнікі бізнесу згодныя з тым, што многія з іх малаэфектыўныя і не прыносяць аддачу для эканомікі».

Удзельнікі пашыранага пасяджэння пастаяннай камісіі абмеркавалі магчымыя дадатковыя прапановы па спрашчэнні дзейнай падатковай сістэмы. Акрамя таго, парламентарыі разгледзелі пытанні напаўняльнасці мясцовых бюджэтаў неабходнымі рэсурсамі, размеркавання расходных паўнамоцтваў паміж узроўнямі бюджэтаў, формы фінансавай дапамогі бюджэтам, якія стаяць ніжэй, а таксама асноўныя кірункі бюджэтна-фінансавай і падатковай палітыкі на 2014 год.

## АДКАЗ БІЗНЕСУ

Пасля пасяджэння ў выканкаме парламенцкая камісія наведала аб'ект прыдарожнага сэрвісу «Грынплаза» на скрыжаванні трас М-1 і М-2, за 8 кіламетраў ад Нацыянальнага аэрапорта «Мінск», будаўніцтва якога плануецца завяршыць сёлета. Гэта паўнавартасны комплекс адпачынку сярод сасновага лесу: гасцініца на 140 месцаў, рэстаран, 10 індывідуальных драўляных дамкоў, два SPA-комплексы, тэнісныя корты, міні-футбольнае поле, інтэрнат для абслуговага персаналу, вадаём, дубовыя алеі...

— Наша гасцініца будзе запатрабаванай, — не сумняваецца **дырэктар кампаніі-забудоўшчыка ТАА «Агорабел» Людміла НІЧВАЮК.** — Па-першае, побач — аэрапорт. Па-другое, дарога Мінск — Масква. Ад Варшавы да Масквы колькасць прыдарожных гасцініц не адпавядае пасажырапатоку. Наш праект ухвалілі ў Міністэрстве транспарту, нас вельмі падтрымалі ў Смалявіцкім раёне.

Але самае галоўнае, тут збіраюцца прапаноўваць высокі ўзровень сэрвісу, экалагічнасць і нацыянальны каларыт. Цікава, што «Грынплаза» размешчана на месцы былой звалкі. На тэрыторыі комплексу забудоўшчыкі ўжо высадзілі каля 400 дрэў, пры гэтым будаўнікі імкнуліся максімальна захаваць існуючыя дрэвы.

Уладальнікі комплексу мяркуюць прапаноўваць сваю пляцоўку для сацыяльных праектаў абласнога маштабу. «Першага чэрвеня мы запросім сюды адораных дзяцей Міншчыны, папросім Максіма Мірнага правесці з імі майстар-клас, — падзялілася марамі Людміла Нічваюк. — Гэта будзе адказ нашага бізнесу мясцовым уладам за падтрымку».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

*Смалявіцкі раён.*

# ЯК «РЭФАРМАВАЛІ» СПАЖЫЎКААПЕРАЦЫЮ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пайшчыкі спажыўкааперацыі — гэта не толькі яе цяперашнія работнікі, але і ветэраны, якія на заслужаным адпачынку, ды і, па вялікім рахунку, усе сельскія жыхары. Па сутнасці, гэта спрадвечная беларуская талака, дзе кожны павінен адчуваць сябе паўнапраўным членам з магчымасцю ўплыву на становішча спраў. На гэта звяртаў увагу і кіраўнік дзяржавы. У пратаколе даручэнняў па выніках вышэйзгаданага рэспубліканскага сходу сказана, што трэба «прыняць меры па павышэнні ролі членаў спажывецкіх таварыстваў, іх зацікаўленасці ў развіцці галіны, а таксама па стымуляванні прыцягнення ў сістэму спажыўкааперацыі новых членаў і інвестараў». А іх колькасць... скарачаецца. У 17 разоў!

Камітэт дзяржкантролю лічыць, што рэарганізацыя праведзена з парушэннямі статута, закона «Аб спажывецкай кааперацыі ў Рэспубліцы Беларусь». Згодна з патрабаваннямі Грамадзянскага кодэкса Беларусі, Гродзенскае абласное спажывецкае таварыства, далучаючы райспажыўтаварыствы, павінна было прыняць усе абавязацельствы рэарганізаваных юрыдычных асобаў у дачыненні да іх членаў, у тым ліку па іх паявых узносах. Пры гэтым фактычна іх члены павінны аўтаматычна станавіцца членамі аблспажыўтаварыства. Аднак, згодна з перадатачным актам маёмасці і спраў раённых спажывецкіх таварыстваў, такія абавязацельствы прыняты не былі. Акрамя таго, перадатачныя акты ў парушэнне заканадаўства не зацверджаны ўласнікамі маёмасці — райспажыўтаварыствамі, якія далучалі. А значыць, нелегітымныя і ўсе далейшыя рашэнні, што прымаліся новай структурай.

Паводле ацэнкі Камітэта дзяржкантролю, аблспажыўтаварыства, па сутнасці, ажыццявіла захоп маёмасці раённых спажывецкіх таварыстваў, свайго «папярэдніка» — аблспажыўсаюза — і іх унітарных прадпрыемстваў. Каласальнае скарачэнне колькасці пайшчыкаў адбылося таму, што імі ў новаўтворанай структуры з'яўляюцца практычна толькі сённяшнія работнікі спажыўкааперацыі. А многія з ранейшых працаўнікоў, якія ўдзельнічалі ў фарміраванні матэрыяльных актываў сістэмы, вясковыя жыхары, пэўна, і не здагадваюцца, што іх сярод пайшчыкаў ужо няма...

## КАМУ СТАЛА ЛЕПШ?

Калі арганізацыя (у гэтым выпадку — райспажыўтаварыства) страчвае статус юрыдычнай асобы, то ўзнікае пытанне: навошта? Якім чынам палепшацца яе ўплыў на становішча спраў на сваёй тэрыторыі, матывацыя лепш працаваць і больш зарабляць? Ці, можа, ад канцэнтрацыі паўнамоўцтваў і фінансаў на абласным узроўні выйграюць і ў раёнах?

У сістэме Белкаапсаюза сярод абласных арганізацый Гродзенскае аблспажыўтаварыства па выніках 2011 года займала другое месца, у 2012 г. — чацвёртае, у 2013 г. — пятае месца. Леташні прыбытак (8 млрд руб.) у параўнанні з 2011 г. скараціўся амаль у 6 разоў. Затое даўгоў усё больш: запазычанасць перавышае 550 млрд руб., не ўлічваючы доўгатэрміновыя крэдыты і пазыкі, а таксама працэнты па іх. Калі гэта не фінансавы крах, то што?

Доля спажывецкай кааперацыі ў гандлёвым абароце вобласці пастаянна зніжаецца. Летась скарацілася рэалізацыя па 33 групах тавараў з 48 падкантрольных, страты гандлёвага абароту склалі 147,8 мільярда рублёў, валавых даходаў — 31 млрд руб.

## ...А КАНКУРЭНТЫ НЕ ДРЭМЛЮЦЬ

Структуры сеткавага гандлю паступова выціскаюць спажывецкую кааперацыю з сельскіх населеных пунктаў і райцэнтраў, дзеля забеспячэння якіх спажыўтаварыствы і ствараліся.

**Паводле ацэнкі Камітэта дзяржкантролю, аблспажыўтаварыства, па сутнасці, ажыццявіла захоп маёмасці раённых спажывецкіх таварыстваў**

— Гэта абумоўлена нізкімі тэмпамі будаўніцтва і рамонту аб'ектаў, невыкананнем санітарных нормаў і асартыментных патрабаванняў, састарэлымі падыходамі да арганізацыі выязнога гандлю, шматлікімі парушэннямі заканадаўства, — лічыць **начальнік аддзела кантролю спажывецкага рынку і сферы паслуг Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці Святлана СІВЯРЧУКОВА**.

Напрыклад, у Воранаўскім філіяле аблспажыўтаварыства за шмат гадоў не здолелі адрамантаваць універмаг, а гандлёвая сетка пабудавала побач супермаркет. Вытрымае ўніверсмаг канкурэнцыю з ім?

Не прымаюцца меры па аснашчэнні аб'ектаў сучасным халадзільным і гандлёвым абсталяваннем, стварэнні неабходных умоў для рэалізацыі прадуктаў харчавання і належнага мікраклімату на рабочых месцах прадаўцоў. Неэфектыўна выкарыстоўваецца тое, што ўжо закуплена. Напрыклад, з-за даўгабуду крамы па вул. Тухачэўскага ў Лідзе і сёння не ўстаноўлена гандлёвае абсталяванне, якое набылі ў 2010 годзе за кошт сродкаў інавацыйнага фонду — амаль на 400 мільёнаў рублёў.

У правераных філіялах больш за палову гандлёвых аб'ектаў, размешчаных у сельскай мясцовасці, не забяспечаны праточнай халоднай і гарачай вадой, не падключаны да сістэмы водаадводу. Як праводзіць санітарную апрацоўку абсталявання, а работнікам выконваць правілы асабістай гігіены?

## ДА ПАКУПНІКА — З ПАДМАНАМ

Паводле справаздачнасці аблспажыўтаварыства перад аблвыканкамам і Белкаапсаюзам, штотыднёва адбываецца маніторынг гандлёвых прадпрыемстваў, каб выявіць праблемы і прыняць адпаведныя рашэнні. У першую чаргу гэта тычыцца праўдзівай інфармацыі (цэннікі, маркіравальныя ярлыкі) і недапушчэння продажу тавараў са скончаным тэрмінам прыдатнасці. Праманіторыць — праманіторылі, а ў крамах...

Напрыклад, па фактах утойвання рэальных цэн на тытунёвыя вырабы і іх неабгрунтаванага завышэння ў дачыненні да групы службовых асоб крамы «Усход-маркет» Смаргонскага філіяла заведзена крымінальная справа. У Ваўкавыскім філіяле бралі з пакупнікоў больш, чым трэба (завышаныя цэннікі), за капусту, фарш, мясны паўфабрыкат... На ўсіх правераных аб'ектах Шчучынскага філіяла выяўлены факты продажу прадукцыі са скончаным тэрмінам захоўвання — 49 найменняў, ад кандытарскіх вырабаў да алкагольных напояў...

## «ПАРТНЁРСТВА» З ІЛЖЭПРАДПРЫМАЛЬНІКАМІ?

Для «штучнага» выканання плана таваразвароту ў гандлі Гродзенскага, Карэліцкага і Мастоўскага філіялаў у апошнія дні снежня мінулага года практыкавалася афармленне продажу тавараў у крэдыт. Такія «фокусы» летась прывялі да 6 крымінальных спраў. У Гродзенскім раёне загадчыца крамы ўнесла фіктыўныя звесткі ў накладныя на водпуск тавараў у крэдыт з мэтай утойвання нястачы. У Карэліцкім філіяле для афармлення таварнага крэдыту ўносіліся пашпартныя звесткі... памерлых людзей. А ў Астравецкім прадавец крамы склала ажно 445 «ліпавых» дагавароў на таварны крэдыт.

Упраўленнем Дэпартамента фінансавых расследаванняў таксама выяўлены факты дагаворных адносін аблспажыўтаварыства з арганізацыямі, уключанымі ў спецыяльны рэестр ілжэпрадпрымальніцкіх структур і замежных юрыдычных асоб, якія дзейнічаюць у Беларусі з парушэннем заканадаўства аб падатках і прадпрымальніцтве. Здзелкі па пастаўках тавару на адрас шэрагу такіх фірмаў не пацвердзіліся, у сувязі з чым аблспажыўтаварыству даналічана больш за 183 мільёны рублёў падатковых плацяжоў.

А ў лістападзе мінулага года прыпынена рэалізацыя хутказамарожаных ягад, нарыхтаваных Ваўкавыскім і Бераставіцкім філіяламі. Прадукцыя не адпавядала якасным паказчыкам па нормах утрыманні цвілі і дражджэй, прасцей кажучы, аказалася сапсаванай. Сярэдні кантрактны кошт продажу ягад (журавін, брусніц, чарніц) на экспарт мог скласці 44 тысячы еўра.

***Калегія Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці рэкамендавала праўленню Белкаапсаюза і аблвыканкаму разгледзець пытанні аб адпаведнасці займанай пасадзе старшыні праўлення Гродзенскага абласнога спажывецкага таварыства Станіслава Мікшы, першага намесніка Жанны Ільіной, а таксама аб эфектыўнасці і адпаведнасці патрабаванням заканадаўства рэарганізацыі аблспажыўтаварыства. Матэрыялы праверкі будуць накіраваны ў праваахоўныя органы.***

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# ГЕРАІНІ НАШАГА ЧАСУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Так, сёння ў Мінску будуць названы пераможцы ў 10 намінацыях — на 1 менш, чым летась. Але работа журы ад гэтага лягчэйшай не зрабілася: усе кандыдаткі як на падбор, вартыя самых добрых слоў і падзяк у свой адрас. Ці выклікае ў каго сумненне, напрыклад, тое, што трохразовая чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў у Сочы Дар'я Домрачава вартая ўзнагароды і тытула «Гонар нацыі»? (Сама спартсменка, праўда, на цырымоніі прысутнічаць не зможа — дыплом, медаль і віншаванні за яе атрымае мама, Ларыса Аляксееўна.) А фрыстайлістка, чэмпіёнка Алімпіяды-2014 Ала Цупер, якая пасля «чорнай паласы» ў спорце і ў жыцці, пасля шэрагу траўмаў, пасля перапынку, звязанага з нараджэннем дачкі, вярнулася ў вялікі спорт і заваявала свой, такі каштоўны для ўсёй краіны залаты медаль, прадстаўлена ў намінацыі «За жаночую мужнасць».

Дырэктар РНПЦ атарыналарынгалогіі, галоўны пазаштатны атарыналарынголаг Мінздрава Людміла Макарына-Кібак, дырэктар сельскагаспадарчага прадпрыемства «Азярыцкі-Агра» Ніна Жалязнова, настаўніца фізкультуры Малатковіцкай сярэдняй школы Пінскага раёна Святлана Новак, якая здолела самастойна патушыць пажар у школе, галоўны ўрач 3-й гарадской дзіцячай бальніцы Мінска Людміла Казачкова, дырэктар Столінскага раённага сацыяльна-педагагічнага цэнтра Святлана Кананчук і яшчэ амаль пяць дзясяткаў удзельніц рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года» — гэта не толькі прафесіяналы сваёй справы і лідары, на якіх варта трымаць раўненне, але і прывабныя жанчыны, проста любімыя маці і бабулі, якім хапае сіл і часу як на сям'ю, так і на актыўную грамадскую дзейнасць. 17 з іх стануць лаўрэаткамі, 35 — дыпламанткамі конкурсу «Жанчына года-2013», які фінішуе сёння ўвечары ў сталічным «Прэзідэнт-атэлі». Усяго ж за час правядзення конкурсу званне яго лаўрэатак атрымалі каля 300 жанчын.

— Гэты конкурс — адно з найбольш знакавых мерапрыемстваў, якія праводзіць наша арганізацыя на працягу года, — заўважае **намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын, кіраўнік аддзялення «Сяльчанка» Рэгіна ДАВІДОВІЧ.** — Ён заўжды праходзіць у асаблівай атмасферы — святочнай, урачыстай, шчырай, душэўнай, і яго вельмі чакаюць на месцах. Потым з кожнай вобласці нам дасылаюць спісы кандыдатур, і часта мы самі адкрываем для сябе новыя імёны і жанчын з цікавым, няпростым лёсам.

Дарэчы, сёння ў краіне дзейнічае 31 жаночае грамадскае аб'яднанне. Беларускі саюз жанчын — самае сталае і самае масавае з іх — мае ўжо больш чым 20-гадовую гісторыю і аб'ядноўвае ў сваіх шэрагах 189,4 тысячы чалавек. Менавіта па ініцыятыве Беларускага саюза жанчын у краіне з 2008 года праводзіцца рэспубліканскі конкурс «Жанчына года», а таксама шэраг іншых маштабных акцый і мерапрыемстваў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ Сёння — Сусветны дзень інтэрнэту

# З'ЯДНАНЫЯ АДНОЙ СЕТКАЙ...

**Яшчэ зусім нядаўна слова «інтэрнэт» было трывала звязана са словам «камп'ютар». Зараз сусветнае павуцінне даступнае не толькі тым, у каго ёсць камп'ютар або планшэт, але нават тым, хто мае мабільны тэлефон.**

Колькасць інтэрнэт-карыстальнікаў пастаянна павялічваецца. Так, паводле інфармацыі Белстата, калі ў 2007 годзе ў Беларусі на адну тысячу юрыдычных і фізічных асоб было 293 абаненты інтэрнэту, то ў 2013 годзе — ужо 996 абанентаў.

Доступ у інтэрнэт з мэтай адпраўкі і атрымання электроннай пошты выкарыстоўваюць 96% рэспандэнтаў, для пошуку і размяшчэння інфармацыі — 93,9%, для ажыццяўлення банкаўскіх аперацый — 90%, для прадастаўлення падатковых дэкларацый — 84,2%, для атрымання бланкаў формаў ад дзяржаўных органаў (арганізацый) — 83,4% абследаваных рэспандэнтаў.

Моладзь любой краіны хутчэй падхоплівае новаўвядзенні і актыўна іх выкарыстоўвае ў паўсядзённым жыцці. Шматіндыкатарнае кластарнае абследаванне па ацэнцы становішча дзяцей і жанчын у Беларусі, праведзенае ў 2012 годзе, пацвярджае гэты факт. Менавіта маладыя людзі ва ўзросце 15-24 гадоў з'яўляюцца найбольш актыўнымі карыстальнікамі інтэрнэту. Па выніках даследавання, 95,3% маладых жанчын і 94,2% маладых мужчын калі-небудзь карысталіся сеткай.

Гараджане выкарыстоўваюць інтэрнэт часцей, чым сельскае насельніцтва: 93,7% жанчын і 92,9% мужчын-гараджан супраць 77,8% жанчын і 70,8% мужчын — сельскіх жыхароў.

Сярод рэгіёнаў больш актыўна інтэрнэтам карыстаюцца жыхаркі Мінска — 96,1% і Гродзенскай вобласці — 95,7%.

**Святлана БУСЬКО.**

■ Палітычная пятніца з Аляксандрам Шпакоўскім



# ВЫБАР ШЛЯХУ І НАПРАМКУ

**25 мая на Украіне маюць адбыцца выбары прэзідэнта. Шмат хто з мясцовых экспертаў лічаць гэту падзею лёсавызначальнай для будучыні ўкраінскай дзяржавы, але ёсць таксама погляд, што вынік выбарчай кампаніі (які б ён ні быў) ніяк не паўплывае на запушчаныя працэсы дэградацыі і распаду. Упершыню за 23 гады незалежнасці прэзідэнцкія выбары пройдуць без удзелу жыхароў Крыма, а фармальна дзейны, але па факце ўжо былы прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч ужо выказаў сумневы ў іх легітымнасці.**

## РАЗНАСТАЙНАСЦЬ КАНДЫДАТАЎ — РАЗ'ЯДНАНАСЦЬ ЭЛІТЫ

Між іншым, увага і грамадская цікавасць да выбараў досыць вялікая, што цалкам зразумела з улікам тых імклівых рэвалюцыйных змен, што разгойдваюць Украіну з канца лістапада мінулага года. Украінскі Цэнтрвыбаркам па стане на 2-е красавіка зарэгістраваў аж 23 прэтэндэнты на пасаду кіраўніка дзяржавы, а яшчэ 20 асобам было адмоўлена ў рэгістрацыі.

Падобная разнастайнасць кандыдатаў і праграм толькі на першы погляд выглядае дасягненнем дэмакратыі і плюралізму думак ва ўкраінскім грамадстве, але па факце хутчэй сведчыць аб раз'яднанасці тамтэйшай палітычнай эліты. Відавочна, што большасць кандыдатаў умоўна можна падзяліць на два лагеры з традыцыйным для Украіны супрацьпастаўленнем ідэй і геаграфічна выразнымі рэгіёнамі электаральнай падтрымкі. Частка прэтэндэнтаў, што ўплываюць на выбаршчыкаў з захаду і цэнтра краіны, выстаўляюць нацыяналістычныя лозунгі і прасоўваюць неабходнасць цывілізавага выбару на карысць Захаду, іншыя, якіх падтрымліваюць выбаршчыкі поўдня і ўсходу, апелююць да савецкага мінулага і выказваюцца на карысць больш цесных стасункаў з Расіяй.

**Падобнае імкненне буйнога бізнесу да ўлады прымушае задумацца, а ці не стане перамога прадстаўніка адной з фінансава-прамысловых груп пачаткам чарговага перадзелу маёмасці на Украіне.**

Такім чынам, вымалёўваецца, што будучыя выбары пройдуць ва Украіне ў духу традыцыйнага супрацьстаяння рэгіянальных фінансава-палітычных кланаў, а ўстаноўкі палітыкаў адрозніваюцца паміж сабой толькі ўзроўнем радыкалізму ідэй. Так, нацыяналістычную рыторыку эксплуатуюць: экс-прэм'ер, старшыня партыі «Батькіўщіна» Юлія Цімашэнка; народны дэпутат, уладальнік фабрыкі «Рашэн», міліярдэр Пётр Парашэнка, камандзір радыкальнага «Правага сектара» Дмітро Яраш, лідар партыі «Свабода» Алег Цягнібок і шэраг іншых кандытаў.

Прыкладна тая ж разнастайнасць назіраецца і ў лагеры апанентаў з ліку ўмоўнага лева-цэнтрысцкага блока: чарговы раз на пасаду прэзідэнта балатуецца лідар камуністаў Украіны Пятро Сіманенка, аж чатыры прэтэндэнты маюць у кішэні членскі білет партыі «Рэгіёны»: былыя віцэ-прэм'ер Юрый Бойка і губернатар Харкаўскай вобласці Міхаіл Добкін, а таксама народныя дэпутаты Сяргей Цігіпка і Алег Цароў.

Цікава, што яшчэ нядаўна гэтыя палітыкі ўжо змагаліся між сабой, але не ў выбарчым супрацьстаянні, а літаральна на барыкадах: калі Цягнібок і Яраш камандавалі баявымі атрадамі Майдана, то Добкін і Цароў фактычна ўзначальвалі «антымайдан» — рух украінскай контррэвалюцыі. Патлумачыць шэраговаму выбаршчыку розніцу паміж такімі ідэнтычнымі палітычнымі дзеячамі ўяўляецца досыць цяжкай справай, таму некаторыя эксперты лічаць, што падобнае масавае «вылучэнне» з'яўляецца элементам гандлю — дзеля таго, каб у далейшым мець магчымасць «зняцца» за адпаведныя дывідэнды на карысць фаварытаў гонкі.

## ФАВАРЫТЫ — ПАЛІТЫКІ-МІЛЬЯРДЭРЫ З ПАМЯРКОЎНАЙ РЫТОРЫКАЙ

Відавочна, што такіх лідараў сёння тры. Згодна з апошнімі сацыялагічнымі апытаннямі гэта Пётр Парашэнка (38,3%), Сяргей Цігіпка (17,9%), Юлія Цімашэнка (11,6). Найлепшыя шанцы пакуль у Парашэнкі, якому ўжо ўдалося заручыцца падтрымкай палітыка-баксёра Віталя Клічко, што скасаваў сваю кандыдатуру на карысць «шакаладнага караля».

Такі электаральны выбар украінцаў цалкам абгрунтаваны, бо і Парашэнка, і Цігіпка з'яўляюцца найбольш памяркоўнымі прадстаўнікамі свайго лагера, з якімі ўкраінскае грамадства звязвае свае надзеі на аб'яднанне і стабілізацыю.

**Цікава, што яшчэ нядаўна гэтыя палітыкі ўжо змагаліся між сабой, але не ў выбарчым супрацьстаянні, а літаральна на барыкадах.**

Радыкальны характар Майдана ўвёў у зман некаторых журналістаў і нават паліттэхнолагаў адносна папулярнасці рэзкіх выказванняў і ідэй сярод украінскага соцыуму. Насамрэч абсалютная большасць грамадства прагне жыць у спакойнай, стабільнай адзінай дзяржаве, дзе сваё месца знойдзе і гісторыя Галічыны, і Савецкая Украіна. Паказальным пацвярджэннем такой думкі з'яўляецца той факт, што такі папулярны палітык, як Юлія Цімашэнка, што апошнім часам шмат звяртаецца да агрэсіўнай рыторыкі, пакуль далёка адстае ад сваіх канкурэнтаў.

## ЦІ ЗДОЛЕЕ БУЙНЫ БІЗНЕС АБ'ЯДНАЦЬ УКРАІНУ?

Зразумела, што бягучая ўкраінская кампанія, як і мінулыя, традыцыйна не абыходзіцца без удзелу буйнога бізнесу. І калі падчас мінулых выбараў «грашовыя мяшкі» пераважна працавалі праз свае палітычныя крэатуры, то гэтым разам з'яўленне мільярдэраў у палітыцы і на дзяржаўнай службе звычайная справа. Фактычна паўнавартасным гаспадаром Днепрапятроўскай вобласці з'яўляецца нядаўна прызначаны губернатарам алігарх Ігар Каламойскі ($2,4 млрд), у Данецку кіруе мільярдэр Сяргей Тарута, а топ-фігуры прэзідэнцкай гонкі Пятро Парашэнка і Сяргей Цігіпка маюць капіталы памерам $2 млрд і $1,2 млрд адпаведна.

Падобнае імкненне буйнога бізнесу да ўлады прымушае задумацца, а ці не стане перамога прадстаўніка адной з фінансава-прамысловых груп пачаткам чарговага перадзелу маёмасці ва Украіне, што праверавым шляхам зноў прывядзе гэтую дзяржаву на кіеўскі Майдан? Вядома, што асноўнай прычынай, якая нарадзіла пратэсты ўкраінцаў, быў зусім не замежны ўплыў ці «еўраінтэграцыя», але сацыяльная несправядлівасць і карупцыя, што панавалі ва ўкраінскім грамадстве. Ці здолеюць мільярдэры ва ўладзе, чый капітал якраз і быў складзены за кошт несправядлівага размеркавання прыбыткаў і багаццяў Украіны, кіраваць па-новаму, так, як гэтага чакае ўкраінскае грамадства?

Вядомы журналіст Савік Шустэр невыпадкова запрасіў на эфір папулярнай праграмы «Шустэр Live» Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнка. Сёння, як ніколі, украінцам патрэбен прыклад кіраўніка-дзяржаўніка, рупліўца і гаспадара. Аляксандр Лукашэнка заклікаў украінскі народ і фінансава-палітычныя эліты да нацыянальнай еднасці і дзяржаўнага патрыятызму. Як аказалася, вопытны медыйшчык Шустэр не памыліўся з выбарам выступоўцы: падтрымка тэзісаў беларускага лідара студыяй праграмы часам дасягала 100%.

Трэба спадзявацца, што падобны пазітыўны пасыл беларускага Прэзідэнта, які адпавядае настрою ўкраінскага народа, будзе пачуты мясцовымі палітыкамі, а Украіна па выніках выбарчай кампаніі выйдзе моцнай, суверэннай і аб'яднанай.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## У АПТЫМАЛЬНЫЯ ТЭРМІНЫ

**У Мінскай вобласці ранні яравыя зерневыя і зернебабовыя пасеяны на плошчы 130 тыс. гектараў — звыш 50% ад запланаванага. Першымі сяўбу завяршылі сельгасарганізацыі Старадарожскага раёна. У цэлым жа закончыць пасяўную гэтых культур у цэнтральным рэгіёне плануюць у аптымальныя тэрміны — за 8-10 дзён.**

Аграрыі пяці раёнаў прыступілі да пасадкі бульбы, а ў Мінскім, Маладзечанскім і Нясвіжскім — гародніны. Акрамя таго, у паўднёвых раёнах, такіх, як напрыклад, Любанскі і Слуцкі, пачалі сеяць лён, у Капыльскім, Мінскім і Салігорскім — кукурузу, у іншых — цукровыя буракі. За выключэннем двух раёнаў, усюды вядзецца сяўба аднагадовых траў.

Як паведамілі ў Камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінаблвыканкама, мерапрыемствы пасяўной ідуць у адпаведнасці з графікам, усе гаспадаркі забяспечаны неабходнай тэхнікай, энерганасычаныя трактары працуюць у 2-3 змены. Акрамя таго, калі гэта неабходна, прыцягваецца тэхніка з прамысловых прадпрыемстваў і арганізацый райцэнтраў і сталіцы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## АНЁЛ У ТВАІМ СЭРЦЫ

**На Гродзеншчыне стартавала ўжо традыцыйная дабрачынная акцыя «Анёл у тваім сэрцы. Ты ў сэрцы анёла», якая праводзіцца па ініцыятыве аблвыканкама і абласнога аддзялення рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускі дзіцячы фонд».**

Падчас трох папярэдніх акцый на дапамогу хворым дзецям прадпрыемствы і арганізацыі, а таксама асобныя грамадзяне пералічылі каля 540 мільёнаў рублёў. Гэтыя сродкі накіраваны на правядзенне аперацый за мяжой, пасляаперацыйны догляд, набыццё медыцынскіх прэпаратаў, а таксама карэкцыйна-развіваючага і іншага абсталявання.

*У рамках акцыі «Анёл у тваім сэрцы. Ты ў сэрцы анёла» для пералічэння грошай працуе разліковы рахунак: №3015575032013 у дырэкцыі па Гродзенскай вобласці ААТ «Белінвестбанк», код 153001739, УНП 500176223.*

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## АДНАГОДКІ РАСКАЖУЦЬ ПРА НАРКОТЫКІ

**У красавіку пачынае работу першы на Гомельшчыне антынаркатычны студэнцкі атрад. Ва ўпраўленні па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Гомельскага аблвыканкама паведамілі, што ў яго набраны 40 студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны.**

Добраахвотнікі пройдуць спецыяльную падрыхтоўку пад патранатам супрацоўнікаў праваахоўных органаў, пасля чаго атрымаюць пасведчанні. Мяркуецца, што пасля гэтага яны змогуць працаваць з моладдзю па прынцыпе: «Роўны навучае роўнага». Маладыя людзі таксама будуць праводзіць розныя мерапрыемствы, накіраваныя на здаровы лад жыцця. На думку арганізатараў, малады чалавек больш давярае свайму аднагодку, чым даросламу. Таму ініцыятары праекта спадзяюцца, што аналагічныя аб'яднанні з'явяцца і ў іншых навучальных установах рэгіёна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## СКАЧКІ... НА АСЛАХ

**5 і 6 красавіка ў агратурыстычным комплексе «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы» ўпершыню пройдуць асліныя скачкі. У праграме мерапрыемства — конкурсы на хуткасць і вынослівасць, кемлівасць жывёл.**



Фота БЕЛТА.

Наезнікі трэніруюцца перад заездамі.

## КРЫМІНАЛЬНЫ КВАРТЭТ

**На 22 тысячы долараў ашуканцы «кінулі» дырэктара камерцыйнай фірмы з Рэчыцы. У прэс-службе следчага ўпраўлення СК па Гомельскай вобласці паведамілі, аб распачынанні крымінальнай справы ў дачыненні да трох раней судзімых жыхароў Рэчыцы і аднаго мінчаніна.**

Мінулай восенню Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Фінляндскай Рэспубліцы прызначаны Аляксандр Астроўскі. Думаецца, ён будзе надалей умацоўваць і пашыраць тыя кантакты і сувязі, якія былі напрацаваны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы і па сумяшчальніцтве ў Фінляндскай Рэспубліцы Уладзімірам Дражыным, які зрабіў вельмі шмат для таго, каб фінскія інвестыцыі былі шырэй прадстаўлены ў Беларусі.

Аддзяленне Пасольства Фінляндыі ў Рэспубліцы Беларусь працуе ў Мінску з 1 кастрычніка 2010 года. Гэта даволі невялікі тэрмін, але мы вучымся працаваць у вашай краіне, пашыраем і ўмацоўваем сувязі з дзяржаўнымі структурамі, развіваем двухбаковыя кантакты ў галіне эканомікі, аказваем падтрымку нашым інвестыцыйным партнёрам.

***— Ці ёсць тэндэнцыі росту тавараабароту паміж краінамі? Якія?***

— У цэлым назіраецца іх рост. Напрыклад, у 2007 годзе імпарт з Беларусі ў Фінляндыю склаў $50,8 млн, а экспарт з Фінляндыі ў Беларусь — $63,5 млн. У 2012 годзе імпарт у Фінляндыю склаў 175,1 млн, а экспарт з Фінляндыі ў Беларусь — $75,1 млн. Такім чынам, нашы краіны маюць досыць паспяховыя паступальныя эканамічныя адносіны. 2013 год у цэлым быў даволі цяжкім для сусветнай эканомікі. Але, вядома ж, мы спадзяёмся, што ў будучыні аб'ёмы гандлю будуць толькі павялічвацца.

**Фінляндыя служыць добрым прыкладам таго, як можна падтрымліваць дружалюбныя адносіны і з Захадам, і з Усходам.**

Па інфармацыі нашай мытнай службы, у 2012 годзе асноўнымі відамі беларускіх тавараў, імпартуемых Фінляндыяй, можна назваць нафтапрадукты, соль, футравую сыравіну, жалеза і вырабы з нелегіраванай сталі. З Фінляндыі ў Беларусь завозілі свінец і свінцовыя вырабы, муку, крухмал, збожжавыя і травы, трыкатажнае палатно, цэлюлозную драўніну і фарбавальнікі.

Вядома, гэта далёка не ўвесь пералік тавараў. Напрыклад, вядомы фінскі брэнд Nokia таксама прадстаўлены ў Беларусі, хоць мяркую, што гэтая прадукцыя імпартуецца ў Беларусь праз Еўропу ці Кітай. У беларускіх крамах можна знайсці прадукцыю кампаніі Valio, — гэта фінскі плаўлены сыр, пастаўкі якога былі наладжаны яшчэ з часоў Савецкага Саюза. Некаторыя брэнды фінскага адзення беларусы могуць набыць сёння ў крамах.

У Фінляндыі можна знайсці, напрыклад, беларускую тэкстыльную прадукцыю. Мяркую, у гэтай галіне ў нашых краін ёсць добрыя магчымасці для супрацоўніцтва.

***— Назавіце найбольш буйныя фінскія інвестыцыйныя праекты ў Рэспубліцы Беларусь.***

— Адным з іх з'яўляецца набыццё фінскай кампаніяй Olvi асноўнага пакета акцый ААТ «Лідскае піва». Вы можаце бачыць на прылаўках беларускіх крам новыя гатункі піва і сідру, а таксама напояў пад фінскімі брэндамі, напрыклад «Angry Birds». Гэта назва гульні для мабільных тэлефонаў, распрацаванай фінскай кампаніяй Rovio, якая стала адной з самых папулярных у свеце.

Існуе шэраг дробных і сярэдніх фінскіх праектаў. Напрыклад, у машынабудаўнічай галіне. Я меў зносіны з фінскімі бізнесменамі, якія валодаюць невялікімі фірмамі ў рэгіёнах Беларусі. Цяпер у краіне дзейнічае 25 прадпрыемстваў з фінскім капіталам. Мне здаецца, што колькасць інвестараў менавіта ў дробным і сярэднім бізнесе ў Рэспубліцы Беларусь магла б быць большай. Ёсць пэўныя рызыкі і складанасці ў інвестыцыйным заканадаўстве Беларусі, якія перашкаджаюць развіццю фінскага бізнесу.

Здаецца, Беларусі трэба інтэнсіўна працаваць над іміджам краіны ў свеце. На жаль, «беларускі брэнд» у ім мае не вельмі моцныя пазіцыі. Замежныя журналісты асвятляюць у асноўным палітычныя праблемы і надаюць гэтаму шмат увагі замест таго, каб распавядаць аб магчымасцях развіцця. І калі гэтая інфармацыя запаўняе ўсю сусветную інфармацыйную прастору, у людзей ёсць толькі адно ўспрыманне краіны — так званы стэрэатып. Аднак існуюць кампаніі, якія працуюць з былымі савецкімі краінамі (у тым ліку і з Беларуссю) і вядуць паспяховыя дзелавыя адносіны з беларускімі партнёрамі, нягледзячы на тое, што рынак Беларусі — не самы просты для замежных кампаній. Яны, напрыклад, бачаць патэнцыял для ўваходжання на рынкі Мытнага саюза праз Беларусь.

***— Якія кірункі з'яўляюцца перспектыўнымі для двухбаковага супрацоўніцтва?***

— Перспектыўнымі я назваў бы галіны энергетыкі, прамысловасці, машынабудавання, будаўніцтва і будаўнічых матэрыялаў. Хацеў бы адзначыць сферы hi-tech і startup. Фінляндыя (асабліва наша сталіца Хельсінкі) з'яўляецца сёння адным з самых цікавых цэнтраў для startup у Еўропе і, магчыма, ва ўсім свеце. Startup — гэта нядаўна створаныя кампаніі або праекты ў асноўным у галіне IT, якія знаходзяцца на стадыі даследавання рынку і пошуку выгаднай рэалізацыі. Гэта венчурныя праекты. Нядаўна ў Хельсінкі прайшла буйная канферэнцыя startup, у якой прынялі ўдзел і беларускія праекты. Я вельмі рады, што беларусы змаглі вывучыць фінскі вопыт, і, спадзяюся, ён будзе карысны ў будучыні для развіцця кампаній startup Беларусі. Новыя сувязі змогуць паглыбіць узаемадзеянне менавіта ў гэтым сектары.

У Фінляндыі малы і сярэдні бізнес адыгрывае вялікую ролю ў развіцці эканомікі краіны. Надаючы асаблівую ўвагу галіне машынабудавання, дрэваапрацоўкі, цяжкай прамысловасці і галіне «зялёных» тэхналогій, фінскае кіраўніцтва сочыць за развіццём інавацый, бо важна не прапусціць новую ідэю, якая можа стаць «другой Nokia». Любая краіна зацікаўлена ў гэтым. Добрым прыкладам з'яўляецца распрацоўка кампаніяй Rovio мабільнай гульні «Angry Birds». У Фінляндыі шырока прадстаўлены сектар інавацыйных распрацовак у сферы IT, шэраг маладых кампаній займае першыя месцы ў сусветных рэйтынгах і зарабляе вялікія грошы. Напрыклад, кампанія Supercell, вытворца такіх гульняў, як «Hayday» і «Clash of Clans» прадала 51% акцый Японіі і атрымала $1,5 млрд, а ў фірме працуюць толькі 100 чалавек.

Мне хацелася б, каб супрацоўніцтва паміж фінскімі і беларускімі ўніверсітэтамі паглыбілася, што дало б магчымасць абмену вопытам на акадэмічным узроўні.

Развіццё адносін у сферы культуры вельмі важна для нашых краін. Напрыклад, сёлета ў Фінляндыі чакаюць правядзення выстаў карцін з Нацыянальнага мастацкага музея і музея Марка Шагала. Я ўпэўнены, што яны будуць мець вялікі поспех, бо многія ведаюць імя Марка Шагала, аднак мала хто ведае, што ён родам з беларускага горада Віцебска.

Нягледзячы на тое, што Беларусь не мае прамога выхаду да Балтыйскага мора, такія буйныя рэкі Беларусі, як Заходняя Дзвіна і яе прытокі, Нёман, упадаюць у яго. Яно асаблівае: не вельмі глыбокае і не вельмі салёнае.

Значную частку прэснай вады, якая паступае ў Балтыку, нясуць беларускія рэкі. Беларусь і Фінляндыя, а таксама іншыя краіны рэгіёна, паспяхова ажыццявілі шэраг праектаў па ахове мора і працягваюць актыўна развіваць узаемадзеянне ў гэтай сферы.

***— Што прывабна для фінскіх турыстаў у Беларусі?***

— На жаль, у Фінляндыі недастаткова інфармацыі пра Беларусь у сферы турызму. У маі 2014 года ў Мінску пройдзе чэмпіянат свету па хакеі, што, я думаю, стане выдатнай магчымасцю для Беларусі паказаць свае турыстычныя маршруты. Многія журналісты і турысты змогуць наяве ўбачыць краіну і яе прыгажосць. Гэта добры шанц для Беларусі паказаць сябе! Напрыклад, калі ва Украіне праходзіў чэмпіянат свету па футболе, многія з турыстаў, якія наведалі спаборніцтвы, запланавалі прыехаць у краіну яшчэ раз. Я думаю, гэта магчыма і ў Беларусі — вядома, пры ўмове таго, што візавая палітыка будзе спрыяць уезду ў Беларусь.

***— Якой вы бачыце будучыню двухбаковых адносін паміж Беларуссю і Фінляндыяй?***

— Я спадзяюся і буду прыкладваць усе намаганні для таго, каб нашы сувязі пашыраліся і паглыбляліся, набывалі новы ўзровень. Бо нашы народы, калі паглядзець на гістарычнае развіццё, маюць шмат агульнага. Абедзве краіны з'яўляюцца суседзямі вялікага партнёра — Расіі. Фінляндыя служыць добрым прыкладам таго, як можна падтрымліваць дружалюбныя адносіны і з Захадам, і з Усходам. Праводзячы такую палітыку, краіна выйграе перш за ўсё ў эканамічным плане, прыцягваючы інвестыцыі і бізнес з заходніх і ўсходніх краін. Самае галоўнае ў сяброўскай палітыцы — гэта разуменне таго, што аб'яднанне або супрацоўніцтва зусім не павінна быць накіравана супраць кагосьці іншага.

**Яўгенія РУПАКОВА**

■ Неасабісты суб'ектыў



# ВЫПРАБАВАННЕ ЧЫСЦІНЁЙ

## Яго наша краіна ладзіць нам нават сваёй назвай. Ці вытрымліваем — вось у чым пытанне

ВЯСНА — час не толькі жыццядайны і самы прыгожы, але ў многім і для многіх вызначальны. Менавіта разам з першым цяплом прыходзіць жаданне памяняць нешта ў жыцці, прааналізаваць свае і тых, хто побач, думкі і ўчынкі. Вясна сваімі пранізлівымі промнямі яскрава высвечвае нас менавіта такімі, якія мы ёсць. Не толькі ў вобразна-псіхалагічным сэнсе — у самым што ні ёсць літаральна-натуральным.

Пра што гэта я? Каб зразумець, варта толькі выехаць за горад на некалькі кіламетраў, збавіць хуткасць і паглядзець уважліва на лес абапал дарогі. Асаблівую ўвагу варта звярнуць на наваколле трас мясцовага значэння ля якой-небудзь вёскі ці пасёлка. Спачатку, калі не прыглядацца, душа пачынае спяваць ад незвычайнай красавіцкай прыгажосці: наскрозь пранізаныя святлом узлескі і самі дрэвы, яшчэ без лісця, але ўжо ў радасным прадчуванні празрыста-зялёнага флёру і птушынага розгалосся на галінках, а пад імі — пяшчотна-блакітныя ды бела-жоўтыя аблокі пралесак ды кураслепу... Толькі спяваць душы нядоўга, бо хочаш не хочаш, а заўважыш, што купка пралесак прабіваецца праз дзіравую выварку, кураслепы растуць сярод брудных пластыкавых бутэлек, а на галінках дрэў гайдаюцца рознакаляровыя цэлафанавыя пакеты. Усё тое, што стала непатрэбным на падворках вяскоўцаў ды дачнікаў, пакрысе за познюю восень ды раннюю вясну «перакачоўвае» ў бліжэйшы хмызняк ці лясок. Гэта мы так «наводзім парадак» на ўласных прысядзібных участках.

Пасля леснікі прыбіраюць (а ў асноўным — сама прырода хавае пад зелянінай) сляды такога нашага руплівага гаспадарання. На наступны год увесну мы зноў «абнаўляем» карціну, паказваючы, якія мы на самой справе. І гэта пры тым, што сёння амаль у кожнай вёсцы стаяць камунальныя кантэйнеры для смецця, якія своечасова вывозяцца. Але ж да кантэйнера дайсці трэба, а хмызы на рэчцы, лясок, арэшнік на старых курганах — за два крокі ад плота ці ад дарогі. А за лета ўсё роўна ўсё зарасце, патоне ды з зямлёй зраўнуецца...

Пры ўсім пры гэтым мы з гонарам кажам, цытуючы прыезджых, якая ў нас чыстая і дагледжаная краіна. Прычым робім гэта абсалютна шчыра, вельмі рэдка задумваючыся пра свой асабісты ўнёсак у гэту чысціню і дагледжанасць. А калі задумацца — ганарыцца, скажу я вам, асабліва няма чым. Чыстай і дагледжанай нашу Беларусь (сама назва якой абавязвае, каб яна такой і была, каб мы яе такой захавалі) робяць не яе жыхары, а спецыяльныя службы — камунальнікі, азеляняльнікі, прыродаахоўнікі. Выпрабаванне чысцінёй без іх мы наўрад ці доўга вытрымалі б. Прычым усе: і вяскоўцы, і гараджане...

НАША дворнічыха Паліна Віктараўна — асоба вельмі акуратная, але надзвычай уразлівая і эмацыянальная. Да таго ж — неабыякавая, бо жыве ў службовай кватэрцы ў нашым жа доме. Варта толькі паслухаць раніцай яе выказванні на адрас тых, хто накідаў у двары паперак і недакуркаў міма смeтніц і на кветнікі, якія Паліна Віктараўна адна (гэта пры тым, што ў доме — 113 кватэр) росціць на гліністай глебе... Але асаблівая зона бітвы нашай дворнічыхі з хлюндрамі-жыхарамі — ліфт. Смецце на падлозе, надпісы на сценах — карацей, тым, хто едзе на сямнаццаты ці дзевятнаццаты паверх, сумна не бывае. Паліна Віктараўна ліфт пастаянна фарбавала, але, як толькі фарба падсыхала, — надпісы з'яўляліся зноў. Месяцы два назад яна гэтую безнадзейную справу пакінула. Цяпер у ліфце шмат цікавага: ад дэвізаў готаў, спрэчак, які футбольны клуб лепшы, МТЗ ці «Дынама» — да роспачна-дзіцячага: «Не хачу ў школу». Гэта пры тым, заўважу, што і бацькі, і дзеці ў нас жывуць прыстойныя: супрацоўнікі банкаў, падатковай інспекцыі, міліцыі (дом будаваўся долевым спосабам, сацыяльнага жылля ў нас няма). Апошняя спроба Паліны Віктараўны паўздзейнічаць на свядомасць была «прапагандысцкай» — яна на дзвярах ліфта павесіла вершык-заклік: «Друг мой, в лифте не кури, не мочись и не сори...» Назаўтра ўсе мы каталіся ў ліфце, на падлозе якога недакурак плаваў у лужыне жоўтага колеру — Паліна з раніцы, убачыўшы гэткае свінства, прыбіраць адмовілася. Надушаныя прыбраныя дамы (у тым ліку і ваша пакорная слуга) грэбліва моршчылі носікі, дагледжаныя мужчыны асцярожна пераступалі лужыну, каб не сапсаваць дарагія скураныя чаравікі... Нарэшце, Паліна злітавалася — узяла анучу, вядро з вадой і за дзве хвіліны прыбрала праблему, якая на працягу дня здавалася ўсім невырашальнай.

...ТЫЯ, каму давялося бываць у Берліне не ў раёне турыстычнага цэнтра, а ў спальных кварталах, вяртаюцца ў стане ціхага шоку. У сталіцы краіны, якая ў нашай свядомасці стала сінонімам парадку і акуратнасці, проста на вуліцах можна ўбачыць выкінутую старую мэблю, летам там складана прайсці, не ўступіўшы ў сабачае... самі ведаеце што, а зімой, калі здараецца снегапад, даводзіцца самім таптаць сцежку да метро. Мясцовыя жыхары да гэтага прывыклі, бо гэта рэчаіснасць: там няма дворнікаў як паняцця. Ніхто не хоча працаваць на гэткай «ганаровай пасадзе», шматлікія мігранты аддаюць перавагу дапамозе па беспрацоўю, да чаго грамадства ставіцца даволі спакойна: маўляў, гэта іх выбар, у нас дэмакратыя...

ЯПРА гэта, прыехаўшы першы раз пасля водпуску, большую частку якога правяла ў сяброў у Нойкёльне (раён Заходняга Берліна), расказвала тут усім знаёмым са здзіўленнем і, прызнаюся, з гонарам: маўляў, мы не такія. І пасля, колькі ні бывала там, гэты гонар, асабліва калі вярталася ў нашу чыстую Белую Русь, не знікаў. А вось цяпер, ведаеце, сумняваюся. Пэўна, таму, што выхадныя няўдалыя атрымаліся: спачатку ў вёску з'ездзіла, а пасля па мікрараёне каля дома пагуляла. А той, хто тэрыторыю павінен прыбіраць, акурат у той дзень ці то загуляў, ці то захварэў...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

■ Варта паглядзець

# Кірыл Мазураў. Непакорлівы беларус

## Прэзентацыя аднайменнай дакументальнай кінастужкі адбудзецца сёння ў Доме Масквы. Аўтар сцэнарыя распавядае падрабязнасці

**Аўтарам сцэнарыя гэтага расійска-беларускага праекта стала наша пісьменніца Наталля Голубева. Яе як гісторыка ў першую чаргу зацікавіла не столькі дзейнасць выдатнага партыйнага і грамадскага дзеяча, колькі асоба Мазурава. На такой «вышыні» ў Савецкім Саюзе ніколі не знаходзіўся ніводзін беларус! Толькі не ўсё ішло так гладка. Пра некаторыя перыпетыі лёсу першага ў свой час чалавека ў рэспубліцы расказалі сцэнарысту яго дочкі. Менавіта яны і стануць галоўнымі «суддзямі» кінастужкі. А пакуль Наталля ГОЛУБЕВА расказвае, чаму варта паглядзець фільм.**

***— Наталля Аляксандраўна, звычайна аўтары выбіраюць сваіх герояў невыпадкова. Чаму менавіта Мазураў?***

— Мне даўно хацелася напісаць ці зняць кіно пра гэтага выдатнага чалавека, паказаць яго ролю і значэнне для рэспублікі. Многае, чым мы сёння ганарымся ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці, культуры, сваімі вытокамі ўзыходзіць да дзесяцігоддзя кіраўніцтва Мазурава, да сярэдзіны складаных 1950—60-х гадоў. Эканамічныя рэформы ніколі не даюць хуткага эфекту, павінны прайсці гады, каб яны прынеслі вынікі. У перыяд Мазурава ў БССР закладваліся асновы нашай будучай стабільнасці, і гісторыя пацвердзіла, што прынятыя тады рашэнні ў многім былі правільнымі. Толькі гэта патрабавала вялікай мужнасці і цвёрдасці ў адстойванні сваёй пазіцыі.

Ва ўмовах жорсткай камандна-адміністрацыйнай сістэмы Кірыл Трафімавіч не баяўся прымаць смелыя рашэнні. Уяўляеце, што такое было не пагадзіцца з рэформамі Хрушчова ў галіне сельскай гаспадаркі, якія прадугледжвалі ліквідацыю прыватнага сектара? А Мазураў знішчаць падсобныя гаспадаркі не дазваляў, больш за тое, ён адстаяў спецыялізацыю. Менавіта ў той перыяд узніклі сённяшнія агракамбінаты «Сноў» Нясвіжскага раёна, «Прагрэс» у Верцялішках, «Рассвет» у Мышкавічах — гонар нашай сельскай гаспадаркі і сёння. На фоне распаду вёскі ў СССР Беларусь разам з Расіяй заставалася адзінай недатацыйнай рэспублікай, у адрозненне ад той жа Украіны. Ці што значыла выступіць супраць ліквідацыі цэнтралізаванай сістэмы кіравання, адмовіцца ад саўнаргасаў у кожнай вобласці як ад неэфектыўнай формы кіраўніцтва эканомікай? Па прыкладзе Мазурава рушылі ўслед 11 рэспублік. Гэта была смеласць, смеласць у інтарэсах дзяржавы. Ён часта спрачаўся, не згаджаўся, адстойваў свой пункт гледжання без аглядкі на тое, што мог страціць пасаду і сапсаваць сабе кар'еру.

***— Што ў біяграфіі непакорлівага беларуса найбольш зачапіла?***



— Яго прынцыповасць і смеласць. Сказаць «не» ўсемагутнаму Берыі, выступіць у падтрымку Хрушчова ў 1957 годзе, калі была распачата спроба яго зняцця з пасады. Мазураў быў упэўнены: пачатыя рэформы ў сельскай гаспадарцы патрэбна працягваць. Ён мог не паехаць на ўсесаюзны семінар у

**Кінастужку сапраўды варта паглядзець. Не пашкадуеце, калі прыйдзеце на яе прэзентацыю сёння ў 18.30 у Дом Масквы, які знаходзіцца на вуліцы Камуністычнай, 86**

Разань і нікога туды з рэспублікі не пусціць, бо разумеў, што вопыт па вытворчасці мяса і малака — ашуканства. Ды не проста не паехаць, а адкрыта сказаць пра гэта на бюро ЦК КПСС, прычым у той час, калі аб дэмакратыі і плюралізме ніхто і падумаць не мог! Нават слоў такіх у лексіконе партыйнай наменклатуры не было.

***— Пра «востранькае» з жыцця партыйнага дзеяча даведаліся, напэўна, ад самых родных?***

— У фільме ўпершыню расказваецца аб зваротным боку адносін у асяроддзі партыйнай вярхушкі. Аб тым, як былыя паплечнікі становяцца непрымірымымі ворагамі, як плятуцца інтрыгі, каб прыбраць з дарогі моцную, незалежную асобу. Менавіта Мазурава на Захадзе называлі ў ліку пераемнікаў Брэжнева. Малады, энергічны, прыхільнік рэформаў... Аб чым рэгулярна дакладваў генсеку старшыня КДБ Андропаў. Пра гэта ўпершыню расказваюць дочкі Мазурава.

***— Ці разлічаны фільм на шырокага гледача?***

— Усе фільмы праекта «Адваротны адлік», якія ствараюцца творчай майстэрняй Уладзіміра Бокуна па заказе тэлеканала АНТ, разлічаны на шырокую глядацкую аўдыторыю. У тым ліку яны павінны быць зразумелымі простаму чалавеку, якому хочацца ведаць сваю гісторыю. У кінастужцы выкарыстана шмат невядомых архіўных дакументаў, матэрыялаў, звязаных з рашэннямі ЦК КПБ, з якіх зняты грыф «сакрэтна» ці «абсалютна сакрэтна». Гэта фільм-расследаванне аб партыйных інтрыгах і складаных узаемаадносінах таго перыяду. Гэта фільм-даследаванне дзейнасці смелага і прынцыповага чалавека, які не клапаціўся пра чыны і званні, а жыў інтарэсамі рэспублікі. Гісторыю нялёгкай, неадназначнай эпохі і незалежнай асобы ў ёй мы хацелі расказаць простай мовай.

***— Многія беларусы і дагэтуль памятаюць Кірыла Мазурава. Не баіцеся, што ў іх уяўленні ён крыху іншы і вам не павераць?***

— Пісаць, здымаць кіно на сучасныя тэмы нашмат складаней, чым пра падзеі, якія даўно мінулі. Вядома, яшчэ ёсць іх удзельнікі, жывыя сведкі. Але тым больш цікавай і адказнай будзе праца. Я не раз паўтарала, што гісторыя — самая канкрэтная навука, дзе ёсць канкрэтны гістарычны факт. На жаль, гісторыю любяць ідэалагізаваць, палітызаваць, кагосьці «паднімаць на шчыт», а чыесьці імёны пакідаць у забыцці. Наша творчая група імкнулася заставацца аб'ектыўнай і, грунтуючыся на канкрэтных гістарычных дакументах, успамінах відавочцаў, паказаць падзеі, асобу Мазурава, яго дзеянні і ўчынкі такімі, якімі яны былі на самой справе.

На прэзентацыю фільма ў Мінск прыехалі тры пакаленні Мазуравых — дзеці, унукі, праўнукі. 7 красавіка, у дзень нараджэння Кірыла Трафімавіча, адбудзецца паказ фільма на маскоўскім тэлеканале ТВЦ, а 9 красавіка — вялікая прэзентацыя ў Маскве. Спадзяюся, што імя Мазурава будзе не толькі вернута гісторыі. І эканамічныя рэформы, прапанаваныя ім ужо ў 70-х гадах разам з Касыгіным, знойдуць свайго даследчыка. Тым больш што многія іх палажэнні, у тым ліку аб сацыяльна-арыентаванай эканоміцы, застаюцца актуальнымі і сёння.

**Вераніка КАНЮТА**

# КАМПОСЦЕРЫ І ВАЛІДАТАРЫ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У транспарце ж людзі (асабліва пажылога ўзросту) працягвалі выказваць незадавальненне: вось лухты навыдумлялі! Зрэшты, новае заўсёды ўспрымаецца насцярожана — так ужо створаны чалавек. Але нельга не прызнаць, што «Мінсктранс», безумоўна, зрабіў крок да прагрэсу. Бо ва ўсім, як прынята казаць, «цывілізаваным свеце» электронная аплата праезду — пройдзены і даведзены «да розуму» этап. Калісь гэта непазбежна чакае і нас. А пакуль новыя кампосцеры і валідатары праходзяць «абкатку», паспрабуем прывесці адказы на самыя распаўсюджаныя пытанні, звязаныя з новай сістэмай.

## НЕ ЗАБЛЫТАЦЦА Ў КАРТКАХ

Праезд ва ўсіх відах транспарту з 1 красавіка можна аплаціць пры дапамозе дзвюх бескантактных смарт-картак (БСК). Адна з іх прызначаецца для аплаты праезду ў метро. І хоць карткі ў «падземцы» — з'ява звыклая, новыя бескантактныя праязныя зручнейшыя за старыя магнітныя тым, што імі не трэба праводзіць па жолабе, а можна проста прыкласці да датчыка на турнікеце. Такой карткай па-ранейшаму можна аплачваць толькі паездкі ў метро. Колькасць паездак можа быць рознай: на месяц (з першага па апошні дзень месяца), на паўмесяца (з 1 па 15 чысло), на дэкаду (з першага чысла месяца да 10, з 11 да 20 і з 21 да апошняга чысла месяца), апроч таго — на перыяд 30, 15 і 10 дзён. Такія карткі будуць дзейнічаць не з пэўнага чысла, а з таго дня, які вы выбераце самі. А яшчэ ёсць праязныя на 5, 10, 20, 30, 40, 50, 60 паездак. Пры набыцці карткі метрапалітэна першы раз давядзецца заплаціць не толькі за будучыя паездкі, але і яе залогавы кошт — 10 тысяч рублёў.

Другая БСК — адзіны праязны «Мінсктранса», ён, як і былыя папяровыя праязныя, можа быць на адзін від транспарту, два, тры, чатыры (уключаючы аўтобус-экспрэс). Падрабязную інфармацыю пра тэрміны іх дзеяння можна знайсці на сайце «Мінсктранса». Такую картку таксама можна набыць на месяц, паўмесяца, дэкаду і на пэўную колькасць паездак — 5, 10, 20, 30, 40, 50 і 60. Калі вы купляеце праязны на пэўную колькасць паездак, выкарыстаць іх можна цягам 60 дзён, пачынаючы з даты пакупкі, ва ўсіх відах транспарту, апроч экспрэс-аўтобуса. Залогавы кошт адзінага праязнога «Мінсктранса», які таксама давядзецца заплаціць пры першай пакупцы, 12 тысяч рублёў.

Важны момант: пакуль сістэма электроннай аплаты праезду толькі ўваходзіць ва ўжытак, транспартнікі рэкамендуюць захоўваць папяровыя чэкі, якія пасажыр атрымлівае пры набыцці БСК. Як той казаў, на ўсялякі пажарны...

## ТАЛОНЫ, ЖЭТОНЫ, SMS

Акрамя электронных праязных, у наземным грамадскім транспарце па-ранейшаму можна аплачваць праезд пры дапамозе аднаразовых талонаў. Толькі кампосцеры для іх цяпер таксама электронныя. Каб прабіць талон, трэба ўставіць яго край, на які ўказвае намаляваная на самім талоне стрэлачка, у адтуліну кампосцера, дачакацца гукавога і светлавога сігналу і дастаць. Пэўныя нязручнасці такога кампасціравання заключаюцца ў тым, што з першага разу ў вузкую шчыліну кампосцера трапіць бывае складана, асабліва калі край талона скамечаны, альбо транспарт гайдае падчас руху.

**Пакуль сістэма электроннай аплаты праезду толькі ўваходзіць ва ўжытак, транспартнікі рэкамендуюць захоўваць папяровыя чэкі, якія пасажыр атрымлівае пры набыцці БСК.**

У метро ж для аднаразовых паездак можна выкарыстоўваць старыя добрыя жэтоны. Але ёсць і яшчэ адно наваўвядзенне: у лютым у метрапалітэне з'явілася такая форма аплаты паездкі, як SMS-білет. Праўда, карыстацца паслугай пакуль што могуць толькі абаненты мабільнага аператара life:). Каб набыць такі білет, трэба даслаць бясплатнае SMS з тэкстам «1» на нумар 2255. У адказ на яго прыйдзе паведамленне з радкамі лічбаў, пасля чаго з рахунку абанента здымуць 3700 рублёў — кошт адной паездкі. Экран тэлефона з тэкстам паведамлення трэба паднесці да счытвальнай прылады на адлегласць 1—2 см. Рэакцыяй на гэта стане зялёная стрэлка, якая загарыцца на турнікеце. Можна ісці. Цікава, што SMS-білеты можна набываць «на будучыню»: яны дзейнічаюць цягам года пасля пакупкі. Пры гэтым, нават калі вы згубіце тэлефон, іх можна будзе аднавіць. Дарэчы, у першы дзень красавіка sms-білетаў скупілі рэкордную колькасць — 4,5 тысячы.

## ПЫТАННІ ЗАСТАЮЦЦА...

Новая сістэма аплаты праезду можа здавацца складанай толькі напачатку, пакуль яе наладзяць, і ўсе прывыкнуць да новых прылад і навучацца карыстацца імі. Многія мінчане ўжо адточанымі да аўтаматызму рухамі, заходзячы ў транспарт, прыкладаюць карткі да валідатараў і кампасціруюць талоны. Але, як паказала практыка, інфармацыйны лікбез у выглядзе лістовак і рэкламных ролікаў «Мінсктранса» «дайшоў» не да ўсіх грамадзян, таму выраз «Тэхніка ў руках дзікуна — кавалак металу» застаецца актуальным.

У той жа час незразумелым для мінчан застаецца пытанне неабходнасці аўтарызаваць праязны ў салоне транспартнага сродку. Бо калі пасажыр ужо заплаціў за картку грошы, ён усё адно можа атрымаць штраф, калі не «адзначыцца» на валідатары. Часам, калі ў руках цяжкія сумкі, рабіць гэта бывае нязручна, а многія зусім забываюцца паднесці картку да датчыка. Спецыялісты «Мінсктранса» тлумачаць такую меру рэалізацыяй права грамадзяніна на праезд, а таксама кантролем пасажырапатоку...

Складана аплаціць праезд цягам прыпынку (і нават некалькіх) у час пік, бо дабрацца да нешматлікіх валідатараў і кампосцераў праблематычна. Таксама сумненні выклікае магчымасць рэвізораў запамінаць усіх пасажыраў, якія заходзяць у транспарт на адным прыпынку разам з імі, каб не аштрафаваць.

Карацей, складанасці пераходнага перыяду ёсць.

Але казаць пра нейкія вынікі і магчымыя карэктывы сістэмы аплаты праезду можна будзе не раней, чым праз месяц, гавораць спецыялісты.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

МТБанк

Наименование банка:

## ЗАО «МТБанк», г. Минск

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | П-т поясн. записки. | 2013 г. | 2012 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 284 261,0 | 217 456,0 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 0,0 | 0,0 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 2 | 473 480,9 | 435 740,6 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 4 | 305 475,2 | 250 075,9 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 3 | 137 909,6 | 99 451,8 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 3 121 309,1 | 2 270 593,1 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 4,4 | 2,4 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 243,9 | 243,9 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 6 | 120 787,6 | 62 280,2 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 303,3 | 8,7 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 7 | 68 531,3 | 79 675,5 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | | 4 512 306,3 | 3 415 528,1 |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 8 | 13 000,0 | 16 903,0 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 9 | 843 960,3 | 379 418,3 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 10 | 2 799 391,0 | 2 549 086,8 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 11 | 330 706,2 | 97 953,0 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 12 | 168,4 | 55,8 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 13 | 77 277,8 | 44 946,0 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 4 064 503,7 | 3 088 362,9 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 14 | 121 857,5 | 121 857,5 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | | 0,0 | 0,0 |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | | 53 494,3 | 12 532,6 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 16 | 25 708,7 | 25 727,4 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 15 | 246 742,1 | 167 047,7 |
| 28 | Всего капитал | 121 | | 447 802,6 | 327 165,2 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 4 512 306,3 | 3 415 528,1 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2013 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | П-т поясн. записки | 2013 г. | 2012 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 824 259,7 | 316 697,0 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 607 511,9 | 237 841,0 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 17 | 216 747,8 | 78 856,0 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 400 543,3 | 271 556,0 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 51 875,3 | 19 304,0 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 18 | 348 668,0 | 252 252,0 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 0,0 | 0,0 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 20 | 6 047,3 | 1 631,1 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 19 | 61 515,1 | 42 826,6 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 143,1 | 244,3 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 21 | 138 538,8 | 62 027,7 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 22 | 46 855,4 | 16 703,5 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 23 | 304 282,9 | 186 422,6 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 24 | 56 237,9 | 34 443,8 |
| 15 | Прибыль(убыток) до налогообложения | 211 | | 180 917,1 | 109 619,4 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 29 627,8 | 15 598,8 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ(УБЫТОК) | 2 | | 151 289,3 | 94 020,6 |
| 16 | Базовая прибыль на простую акцию | | | 1,07 | 0,66 |
| 17 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | 1,07 | 0,66 |

### ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2013 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей капитала: Уставный фонд | Эмиссионный доход | Резервный фонд | Накопленная прибыль (убыток) | Фонды переоценки статей баланса | Всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1. | Остаток на 1 января 2012 г. | 3011 | 121 857,5 | 0,0 | 12 532,6 | 73 027,1 | 18 796,7 | 226 213,9 |
| 1.1. | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | | | | | | |
| 2. | Изменения статей капитала | 3012 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 94 020,6 | 6 930,7 | 100 951,3 |
| | В том числе: | | | | | | | |
| 2.1. | совокупный доход | 30121 | * | * | * | 94 020,6 | 6 930,7 | 100 951,3 |
| 2.2. | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | 0,0 | * | 0,0 | 0,0 | * | 0,0 |
| 2.3. | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 0,0 | 0,0 | * | 0,0 | * | 0,0 |
| 2.4. | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 0,0 | 0,0 | * | * | * | 0,0 |
| 2.5. | выплата дивидендов акционерам | 301232 | * | * | * | 0,0 | * | 0,0 |
| 2.6. | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | 0,0 | * | * | * | * | 0,0 |
| 2.7. | перераспределение между статьями капитала | 30125 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| 2.8. | прочие изменения | 30126 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| 3. | Остаток на 1 января 2013 г. | 3013 | 121 857,5 | 0,0 | 12 532,6 | 167 047,7 | 25 727,4 | 327 165,2 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4. | Остаток на 1 января 2013 г. | 3011 | 121 857,5 | 0,0 | 12 532,6 | 167 047,7 | 25 727,4 | 327 165,2 |
| 5. | Изменения статей капитала | 3012 | 0,0 | 0,0 | 40 961,7 | 79 694,4 | -18,7 | 120 637,4 |
| | В том числе: | | | | | | | |
| 5.1. | совокупный доход | 30121 | * | * | * | 151 289,3 | 9 598,0 | 160 887,3 |
| 5.2. | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | 0,0 | * | 39 701,0 | -39 701,0 | * | 0,0 |
| 5.3. | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 0,0 | 0,0 | * | -40 249,9 | * | -40 249,9 |
| 5.4. | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 0,0 | 0,0 | * | * | * | 0,0 |
| 5.5. | выплата дивидендов акционерам | 301232 | * | * | * | -40 249,9 | * | -40 249,9 |
| 5.6. | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | 0,0 | * | * | * | * | 0,0 |
| 5.7. | перераспределение между статьями капитала | 30125 | 0,0 | 0,0 | 1260,7 | 8356,0 | -9616,7 | 0,0 |
| 5.8. | прочие изменения | 30126 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| 6 | Остаток на 1 января 2014 г. | 3013 | 121 857,5 | 0,0 | 53 494,3 | 246 742,1 | 25 708,7 | 447 802,6 |

### СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2013 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2013 год | 2012 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль за отчетный период | 301211 | | 151 289,3 | 94 020,6 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода за отчетный период | 301212 | | 9 598,0 | 6 930,7 |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1. | переоценка основных средств | 3012121 | | 9 598,0 | 6 930,7 |
| 2.2. | переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | | | |
| 2.3. | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | | |
| 2.4. | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | | |
| 2.5. | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | | |
| 3 | ИТОГО совокупный доход за отчетный период | 30121 | | 160 887,3 | 100 951,3 |

### ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2013 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт прим. | 2013 | 2012 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 773 223,7 | 301 349,4 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | -601 756,9 | -233 748,6 |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 409 843,3 | 246 217,0 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | -51 654,6 | -19 355,2 |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами идрагоценными камнями | 70104 | | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | 6 047,3 | 1 631,0 |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 57 023,9 | 38 925,9 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | 143,1 | 244,0 |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 33 664,3 | 15 882,4 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | -324 476,0 | -212 255,7 |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | -28 749,7 | -15 599,0 |
| 13 | **Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и обязательствах** | **701** | | **273 308,4** | **123 291,2** |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | 37 979,9 | 72 477,2 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | 20 891,7 | 181 651,0 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | 3 736,6 | 25 461,8 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | -1 931 404,3 | -1 244 786,1 |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | 18,4 | 20,8 |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | -297 894,6 | -216 654,5 |
| 20 | **Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов** | **702** | | **-2 166 672,3** | **-1 181 829,8** |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | -32 340,0 | -30 180,0 |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 539 285,5 | 114 079,9 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 1 219 745,4 | 1 092 955,3 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | 278 449,2 | 62 241,5 |
| 25 | Чистый прирост(снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | 155,7 | 43,3 |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | 171 053,3 | 130 110,6 |
| 27 | **Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств** | **703** | | **2 176 349,1** | **1 369 250,6** |
| 28 | **Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности** | **70** | | **282 985,2** | **310 712,0** |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов | 71100 | | -96 154,9 | -21 065,2 |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов | 71101 | | 2 065,9 | -1,0 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | -244,0 |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | - |
| 35 | Погашение(реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | - | - |
| 36 | **Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности** | **71** | | **-94 089,0** | **-21 310,2** |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | -40 249,9 | - |
| 42 | **Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности** | **72** | | **-40 249,9** | **0,0** |
| 43 | **Влияние изменений официального курса на денежные средства и их эквиваленты** | **73** | | **21 743,9** | **7 021,3** |
| 44 | **Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов** | **74** | | **170 390,2** | **296 423,1** |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | 1 | X | 578 720,1 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 1 | 749 110,3 | X |

Руководитель А.К. Жишкевич

Главный бухгалтер В.В. Ермолович

Дата подписания 27 января 2014 года

**Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта:
http://www.mtbank.by/about/reporting/balansbanka**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 13, выдана Национальным банком Республики Беларусь 6 мая 2013 года на следующие виды деятельности. УНП 100394906*

## Аудиторское общество с ограниченной ответственностью

220090, г. Минск,
Логойский тракт, 22а, пом. 46, к. 410
тел./факс 268 52 96, тел. 268 52 97,
268 52 98 e-mail: auditel@mail.ru

Аудитэл

р/с 3012007218011
в «Приорбанк» ОАО
ЦБУ 100 г. Минск, код 749
УНП 100591487

**Исх. 5а**
**03 февраля 2014 г.**

### АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ
### по годовой финансовой отчетности ЗАО «МТБанк»
### за период с 01 января по 31 декабря 2013 года

***Председателю Правления ЗАО «МТБанк»***

**Аудируемое лицо:**

Закрытое акционерное общество «Минский транзитный банк» (ЗАО «МТБанк»);

место нахождения (юридический адрес): 220033, г. Минск, Партизанский проспект, 6-а;

сведения о государственной регистрации: зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 14.03.1994, регистрационный № 38;

УНП 100394906;

Аудиторская организация:

Аудиторское общество с ограниченной ответственностью «Аудитэл»;

место нахождения (юридический адрес): 220090, г. Минск, Логойский тракт, 22а, пом. 46, к. 410;

сведения о государственной регистрации: АООО «Аудитэл» имеет свидетельство о государственной регистрации коммерческой организации, выданное Минским городским исполнительным комитетом решением от 28 сентября 2000 г. № 1097;

УНП 100591487.

Нами проведен аудит прилагаемой годовой финансовой отчетности ЗАО «МТБанк», состоящей:

из бухгалтерского баланса на 01.01.2014;

отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств с 01 января по 31 декабря 2013 года;

пояснительной записки;

а также составленной на основании годового отчета ЗАО «МТБанк» отчетности по формам 2801 «Расчет достаточности нормативного капитала», 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе», 2809 «Расчет ликвидности».

Руководство ЗАО «МТБанк» несет ответственность за подготовку и представление годовой финансовой отчетности ЗАО «МТБанк» в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной годовой финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данной годовой финансовой отчетности и соответствии совершенных ЗАО «МТБанк» банковских и иных операций законодательству, основанное на результатах проведенного аудита.

Аудит проведен в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной годовой финансовой отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытие информации в годовой финансовой отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения годовой финансовой отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения годовой финансовой отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля ЗАО «МТБанк» с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а не для выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления годовой финансовой отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

По нашему мнению, годовая финансовая отчетность ЗАО «МТБанк», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение Банка на 1 января 2014 г., результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2013 г., при этом совершенные ЗАО «МТБанк» банковские и иные операции во всех существенных отношениях соответствуют законодательству.

Нами подтверждена достоверность информации, включенной в отчетность по формам 2801 «Расчет достаточности нормативного капитала», 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе», 2809 «Расчет ликвидности».

Директор АООО «Аудитэл» А.И. Папковский

Аудитор, возглавлявший аудит О.А. Богданкевич

Дата подписания: 03 февраля 2014 г.

Аудиторское заключение получено:
Председатель Правления ЗАО «МТБанк» А.К. Жишкевич
Дата получения: 03 февраля 2014 г.

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

**03 мая 2014 г. в 10.00 в здании Подлабенского сельского исполнительного комитета (аг. Подлабенье, ул. Солнечная, 17)**
**состоится аукцион по продаже в частную собственность гражданам Республики Беларусь земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов**

| Номер лота | Кадастровый номер и адрес земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке земел.- кадастр. документации (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1 | 422080405101000036, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Добровольщина, У-20/А | 0,1499 | Для строительства и обслуживания жилого дома | 20 000 000 | 2 000 000 | 5 000 000 | 0,1499 – водоохранная зона водных объектов |
| 2 | 422080405101000037, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Добровольщина, У – 21/А | 0,1500 | Для строительства и обслуживания жилого дома | 20 000 000 | 2 000 000 | 5 000 000 | 0,1500 – водоохранная зона водных объектов |
| 3 | 422080405101000038, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Добровольщина, У – 22/А | 0,1500 | Для строительства и обслуживания жилого дома | 20 000 000 | 2 000 000 | 5 000 000 | 0,1500 – водоохранная зона водных объектов |
| 4 | 422080405101000039, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Добровольщина, У – 23/А | 0,1500 | Для строительства и обслуживания жилого дома | 20 000 000 | 2 000 000 | 5 000 000 | 0,1500 – водоохранная зона водных объектов |
| 5 | 422080405101000040, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Добровольщина, У – 24/А | 0,1430 | Для строительства и обслуживания жилого дома | 20 000 000 | 2 000 000 | 5 000 000 | 0,1430 – водоохранная зона водных объектов |
| 6 | 422080405101000041, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Добровольщина, У – 25/А, | 0,1430 | Для строительства и обслуживания жилого дома | 20 000 000 | 2 000 000 | 5 000 000 | 0,1430 – водоохранная зона водных объектов |
| 7 | 422080405101000042, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Добровольщина, У – 26/А | 0,1457 | Для строительства и обслуживания жилого дома | 20 000 000 | 2 000 000 | 5 000 000 | 0,1457 – водоохранная зона водных объектов |
| 8 | 422080405101000043, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Добровольщина, У – 27/А | 0,1456 | Для строительства и обслуживания жилого дома | 20 000 000 | 2 000 000 | 5 000 000 | 0,1456 – водоохранная зона водных объектов |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462 и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) со дня опубликования настоящего извещения и **до 17.00 30 апреля 2014 г.** представляет в комиссию по организации и проведению аукциона по адресу: **аг. Подлабенье, ул. Солнечная, 17,** документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка;

копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10% от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет ГУ МФ РБ по Гродненской области Подлабенский сельисполком, № 3600514090147 в филиал № 400 АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, код 752, назначение платежа 04901, УНН – 500563252, с отметкой банка о его исполнении;

гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представитель гражданина – нотариально удостоверенную доверенность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Контактные телефоны: **(8-0152) 930 670, (8-0152) 930 646, (8-0152) 930 619**.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания его несостоявшимся внести плату за земельный участок на расчетный счет ГУ МФ РБ по Гродненской области Подлабенский сельисполком, № 3600514090147 в филиал № 400 АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, код 752, назначение платежа 04901, УНН 500563252, а также возместить затраты на организацию и проведение аукциона, (суммы, указанные в графе 6, подлежат корректировке исходя из фактических затрат) на вышеуказанный расчетный счет с назначением платежа 04616;

осуществить в двухмесячный срок со дня получения выписки из решения о предоставлении земельного участка победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона государственную регистрацию права на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» (г. Гродно, ул. Захарова, 27);

приступить к освоению земельного участка в течение 1 года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство).

Шаг аукциона – 10% от предыдущей цены, называемой аукционистом.

---

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**
**извещает об отказе от проведения 14 апреля 2014 года аукционных торгов по продаже конфискованного капитального строения с инвентарным номером 600/С-106, расположенного по адресу: Минский район, Петришковский с/с, д. Шубники д. 55**
*(извещение о проведении торгов было опубликовано в газете «Звязда» 13.03.2014)*
**Тел. для справок 327-40-22.** УНП 190398583

---

Утерянные квитанции о приеме денежных средств (страховых взносов) 1-СУ серии КС №№ 3605433, 3635638, 3635663, 3635664, 3635669 и страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь (договор внутреннего страхования) серии ВС №№ 9165106, 9165126 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными.**

---

БЕЛАРУСБАНК

**Открытое акционерное общество**
**«Акционерный сберегательный банк «Беларусбанк»**
сообщает о проведении 9 апреля 2014 года 81-го тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях в филиале № 529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк» по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 56 (конференц-зал, 3-й этаж).

**Начало тиража в 11.00. Телефон для справок: 147 Контакт-центр.**

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

---

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**(о проекте строительства объекта «Застройка микрорайона «Лошица-9». 1-я очередь. Жилой дом № 5 по генплану»)**

**Информация о застройщике**: Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник – четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 7 по ул. Киреенко, фактический срок строительства 16 месяцев.
2. Жилой дом № 26 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства 13 месяцев.
3. Жилой дом № 22 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 10 месяцев.
4. Жилой дом № 1 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.
5. Жилой дом № 3 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 13 месяцев.
6. Жилой дом № 5 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.

**Информация о проекте и об объекте строительства:**

Цель проекта – строительство административного помещения в составе многоквартирного жилого дома.

Положительное заключение государственной экспертизы № 355-15/12 от 12.06.2012 г.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Ленинский район, жилой дом № 5 по генплану в застройке микрорайона «Лошица-9». 1-я очередь строительства.

**Характеристика объекта.**

Объект – административное помещение общей площадью – 107,73 м², расположенное на 1-ом этаже 115-квартирного 10-этажного крупнопанельного жилого дома серии М464-У1. Помещение строится без выполнения в полном объеме подготовительных работ под отделку стен и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза и приборов учета воды).

Стены: наружные, внутриквартирные и межквартирные перегородки – железобетонные панели. Перекрытия – железобетонные. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1 м² общей площади административного помещения на дату опубликования проектной декларации – **13 200 000 рублей.**

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 770 от 15 марта 2012 г., свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 21 мая 2012 г. № 500/600-2123. Площадь земельного участка – 0,1670 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

Начало строительства жилого дома – 3-й квартал 2013 г., предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – 2-й квартал 2014 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома № 770 от 15 марта 2012 г. собственными силами без заключения договоров подряда.

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир:**

Прием заявлений от граждан и юридических лиц осуществляется отделом собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД» ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник–четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.

Если лицо, желающее принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явилось для заключения договора и не сообщило об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ОАО «МАПИД» оставляет за собой право заключить договор на заявленное административное помещение с другим лицом.

Ознакомиться с планировками квартир можно на сайте ОАО «МАПИД» **www.mapid.by.**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА:

| № лота | Наименование имущества | Место нахождения имущества | Собственник | Начальная цена продажи лота, рублей (без учета НДС) | Задаток 10%, рублей (без учета НДС) | Сумма шага аукциона 5% | Реквизиты для оплаты задатка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **ИМУЩЕСТВА (без учета НДС)** | | | | | | |
| 1 | Дебиторская задолженность Терещенко Виктории Николаевны, уценка 10% | г. Гомель, ул. Красноармейская, д. 34а, к. 3 | **ООО «ПОЛКАР-ИМПЭКС»** | **90 000 000** | **9 000 000** | **4 500 000** | р/с 3012130244068 в ОАО «Банк БелВЭБ», код 226, УНП 400389178 |
| 2 | Дебиторская задолженность Пискунова Виктора Владимировича, уценка 10% | г. Гомель, ул. Барыкина, 154, ком. 24 | **ОДО «ВикторСтрой»** | **49 368 625** | **4 936 863** | **2 468 431** | р/с 3012132096009 в ОАО «Банк БелВЭБ», код 226, УНП 490650034 |

**Организатор торгов – частное унитарное предприятие по антикризисному управлению «Трастсистем».**

С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.30.

Задаток перечисляется **до 12.05.2014 г.** (включительно) по реквизитам, указанным выше.

Условия продажи – без условий.

С лотами можно ознакомиться с 10.00 по 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, д. 20, холл второго этажа Экономического суда Гомельской области, по предварительному согласованию по тел. 80296727136.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 календарных дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 календарных дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

**Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления до 16.00. 12.05.2014 года по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, д. 20, холл второго этажа Экономического суда Гомельской области, по предварительному согласованию по тел. 80296727136.**

**Дата, время, место проведения открытого аукциона 13.05.2014 года в 14.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, д. 20, холл второго этажа Экономического суда Гомельской области.**

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: 8(029) 672-71-36, 8(232)527136.**

---

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по объекту «Многоквартирные жилые дома со встроенными помещениями общественного назначения по генплану №№ 12, 13, 14, 20 в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко». 2-я очередь строительства. Жилой дом № 12 по генплану»,**
*опубликованную в газете «Звязда» 29.11.2013 года»*

**Застройщик:** Общество с ограниченной ответственностью «БелБизнесРесурс», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 15 декабря 2006 г. № 2548 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190782901.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, переулок Червякова, дом 21А, помещение 3, кабинет 6.

**Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (017) 388 54 64, 8 (029)654 10 10, 8(029)708 46 64.**

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц в жилом доме №12 по ГП:

2-, 3-комнатные квартиры – при оплате в рассрочку 1500 (одна тысяча пятьсот) долларов США, при условии 100% единовременной оплаты стоимость 1400 (Одна тысяча четыреста) долларов США.

4-комнатные и 5-комнатные квартиры (2-уровневые от 138 м²) в рассрочку 1350 (одна тысяча триста пятьдесят) долларов США, при условии 100% единовременной оплаты стоимость 1300 (Одна тысяча триста) долларов США.

---

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по объекту «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения по генплану № 11 в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко. Жилой дом № 11 по генплану. 1-я очередь строительства,**
*опубликованную в газете «Звязда» 13.12.2012 года»*

**Застройщик:** Общество с ограниченной ответственностью «Фармоэкспотех», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 22 ноября 2007 г. № 2720 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101472333.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, пер. Червякова, дом 21А, пом. 5, каб. 3.

Почтовый адрес: Республика Беларусь, 220020, г. Минск, пр-т Победителей, д. 89, кор. 2, пом. 10, каб. 18, 41. **Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (029)654 10 10, 8 (029) 708 46 64.**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц:

Стоимость 1 кв.м 2-комнатных квартир при оплате в рассрочку 1500 (одна тысяча пятьсот) долларов США, при условии 100% единовременной оплаты стоимость 1450 (Одна тысяча четыреста пятьдесят) долларов США;

3-, 4-комнатных квартир при оплате в рассрочку 1450 (одна тысяча четыреста пятьдесят) долларов США, при условии 100% единовременной оплаты стоимость 1400 (Одна тысяча четыреста) долларов США.

Стоимость неизменна до окончания строительства. Оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

■ Напярэдадні чэмпіянату

# Кадравага «голаду» не будзе

**Праблем з забеспячэннем кадрамі прадпрыемстваў грамадскага харчавання і гандлю падчас правядзення чэмпіянату свету па хакеі быць не павінна. Пра гэта ў тым ліку ішла гаворка на чарговым пасяджэнні падкамітэта па пытаннях гандлёвага забеспячэння, якое прайшло ў Міністэрстве гандлю.**

Як было адзначана, на выпадак неабходнасці створаны кадравы рэзерв — 183 чалавекі. Таксама дапамогу гораду ў неабходных кадрах гатова аказаць міністэрства. Не павінна ў гэтым кантэксце ўзнікнуць праблем таксама і з аб'ектамі гандлю і грамадскага харчавання на асноўных спартыўных арэнах.

Апроч іншых пытанняў, што разглядаліся на пасяджэнні падкамітэта, была і арганізацыя выставы-продажу нацыянальнай сувенірнай прадукцыі на плошчах гандлёвага цэнтра «Арэна-Сіці». Было, у прыватнасці, адзначана, што беларускія прадпрыемствы праявілі даволі высокую актыўнасць для таго, каб прыняць удзел у выставе. У іх ліку «Белкніга», РУП «Слуцкія паясы», «Белсаюздрук», дзяржаўнае вытворчае гандлёвае аб'яднанне «Белмастацтвапромыслы», Баранавіцкае баваўнянае аб'яднанне, шклозавод «Нёман», «Добрушскі фарфоравы завод», Аршанскі льнокамбінат, «Галантэя» і шэраг іншых прадпрыемстваў.

Кожнаму з удзельнікаў у «Арэне-Сіці» будзе прадастаўлена па 6 квадратных метраў гандлёвай плошчы. Акрамя таго, 300 «квадратаў» дадаткова выдзеляць для прадпрыемстваў канцэрна «Беллегпрам».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЛЯЛЕЧНЫ ДОМІК



**У сталіцы гасцявалі лялькі з Расіі, краін Балтыі і Еўропы. У Мінску прайшла выстава аўтарскіх лялек «Панна Doll'я». Усяго ў экспазіцыі было паказана каля тысячы работ майстроў з 16 краін свету. Лялькі зроблены з розных матэрыялаў: ад караля лялечнай вытворчасці фарфору да воўны, тэкстылю, халоднай і гарачай пластыкі (палімернай гліны).**

**Любоў БЯЛЯЕВА. Фота аўтара.**





# Балельшчыкі змогуць гуляць да раніцы

**Для персаналу, што будзе працаваць у сталічных зонах гасціннасці падчас чэмпіянату свету па хакеі, падрыхтавалі форменнае адзенне: белы верх, чорны ніз, бейсболка белага колеру з гербам, а таксама шалік альбо гальштук з элементам нацыянальнай сімволікі. Частка прадстаўнікоў персаналу будзе працаваць у форме, стылізаванай пад традыцыйнае беларускае адзенне.**

Пра гэта паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама. Для зон гасціннасці закуплена і спецыяльная мэбля — драўляныя сталы і крэслы. Сярод харчовай прадукцыі, якую будуць прапаноўваць гасцям, — шашлык, смажаныя каўбаскі, крылцы, сасіскі. Таксама ў меню — бліны, піца і іншыя стравы.

Нагадаем, што падчас чэмпіянату свету па хакеі ў сталіцы плануюць стварыць тры так званыя «зоны гасціннасці» — у Студэнцкай вёсцы, ля Мінскага лядовага палаца і ў раёне Палаца спорту. Яны ўключаюць у сябе гандлёвыя рады, аб'екты грамадскага харчавання, пункты абмену валют, пляцоўкі для правядзення разнастайных мерапрыемстваў і інш. Зона гасціннасці ля Палаца спорту ў дні адкрыцця чэмпіянату, а таксама падчас фіналаў і паўфіналаў будзе чакаць наведнікаў з 10 да 3 гадзін, а ў астатнія дні — з 11.00 да 24.00. У Студэнцкай вёсцы большасць аб'ектаў будзе працаваць штодзённа з 10.00 да 3.00, а месцы грамадскага харчавання пры інтэрнатах збіраюцца адкрывацца яшчэ на дзве гадзіны раней. Зона гасціннасці ля Мінскага лядовага палаца спорту чакае турыстаў з 10.00 да 24.00.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

# Пасажырам чыгункі — максімум зручнасцяў і камфорту

**Для арганізацыі абслугоўвання замежных гасцей і ўдзельнікаў чэмпіянату свету па хакеі, аказання неабходнай дапамогі і даведачных паслуг на Брэсцкім і Мінскім вакзалах, прыпыначных пунктах Масюкоўшчына і Лошыца Беларуская чыгунка стварыла інфармацыйныя групы. У іх склад увайшлі прадстаўнікі пярвічных арганізацый БРСМ Мінскага і Брэсцкага аддзяленняў магістралі — маладыя камунікабельныя людзі да 30 гадоў.**

Акрамя таго, як інфармуе прэс-цэнтр Беларускай чыгункі, будуць створаны спецыяльныя падраздзяленні з удзелам валанцёраў. На станцыі «Мінск-Пасажырскі» ў месцах асноўных пасажырапатокаў будуць адкрыты чатыры інфармацыйныя цэнтры. Галоўны з іх размесціцца ў зале чакання, дзе будуць працаваць спецыялісты «Мінгардаведкі» і турыстычнага цэнтра «Дартур» Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі.

Работнікі інфармацыйных цэнтраў акажуць інфармацыйную падтрымку гасцям чэмпіянату, патлумачаць, як прайсці да аб'ектаў абслугоўвання пасажыраў на вакзале, да месцаў пражывання і спартыўных арэн, пасадзейнічаюць у карыстанні транспартнымі паслугамі, выкліку таксі ці насільшчыка.

Турыстычны цэнтр «Дартур» арганізуе экскурсійнае абслугоўванне грамадзян, дапаможа ў пошуку месцаў у гасцініцах, хостэлах; калі трэба, забраніруе іх, закажа месцы ў рэстаранах. Для тых, хто пажадае азнаёміцца бліжэй з нашай сталіцай, будуць прапанаваны штодзённыя аўтобусныя экскурсіі «Мінск — сталіца Рэспублікі Беларусь». Яны будуць пачынацца ад чыгуначнага вакзала. Пачатак рускамоўных экскурсій у 10, 14 і 17 гадзін. На англійскай мове — у 12 гадзін.

На вакзале станцыі «Мінск-Пасажырскі» свае паслугі гасцям прапануе зала павышанай камфортнасці «Клуб СВ». Ён размешчаны на другім паверсе вакзала і ў першую чаргу абслугоўвае пасажыраў, якія набылі білет у вагон СВ. Адміністратары клуба валодаюць англійскай мовай. Асаблівая ўвага ў «Клубе СВ» надаецца арганізацыі бізнес-паслуг. Пасажырам прапануюць магчымасць бесправаднога падключэння да інтэрнэту, пры неабходнасці забраніруюць чыгуначныя білеты, месцы ў гасцініцах, дапамогуць набыць білеты ў тэатр ці на канцэрт. Таксама выклічуць таксі, насільшчыка, пазнаёмяць з турыстычнымі праграмамі ў Мінску і іншых беларускіх гарадах.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Інфарм-укол

# БАЮ-БАЮ... НЕ ЗАСЫНАЮ

**Многімі даследаваннямі ўстаноўлена, што непаўнацэнны сон прыводзіць да пагаршэння памяці, зніжэння ўвагі і прадукцыйнасці працы. Парушэнні сну — адна з найбольш частых скаргаў, якія прымушаюць хворых звяртацца да ўрачоў розных спецыяльнасцяў. Колькасць людзей, якія скардзяцца на дрэнны сон, пастаянна расце, прычым і сярод пажылых, і сярод маладых. Гэта не толькі медыцынская праблема. Важную ролю адыгрываюць рэжым працы і адпачынку, індывідуальныя асаблівасці біялагічных рытмаў, падтрыманне элементарнай гігіены сну.**

## Якім бывае парушэнне сну?

**1.** Немагчымасць заснуць у звычайны час на фоне трывогі, страху і назойлівых думак.

**2.** Неглыбокі трывожны сон з частымі абуджэннямі.

**3.** Абуджэнне на некалькі гадзін раней, чым звычайна. Неспакойны сон пры спробе заснуць зноў. Часта назіраецца ў пажылых і пры дэпрэсіўных станах.

**4.** Адсутнасць аднаўлення сіл пасля абуджэння.

**5.** Санлівасць і дрымота ў дзённы час.

**РАССТРОЙСТВУ СНУ СПРЫЯЮЦЬ:**

нявырашаныя канфлікты, цяжкая жыццёвая сітуацыя, пачуццё неспакою, трывога, дэпрэсія, боль, высокая тэмпература, сексуальныя праблемы, павышаны артэрыяльны ціск, ужыванне стымулятараў, пераяданне, змена клімату, змена абстаноўкі (новае акружэнне, новы ложак).

Паводле слоў **урача псіхіятра-нарколага Мінскага гарадскога псіхіятрычнага дыспансера Аляксея ТАРЫКАВА,** перш чым ісці да ўрача, трэба задумацца пра лад жыцця, распарадак дня, пра ліквідацыю сітуацый, якія ўзбуджаюць і правакуюць стрэс. Калі такія захады не даюць патрэбнага эфекту, звяртаюцца да медыкаментознага лячэння.

Снатворныя адрозніваюцца сваім хімічным саставам, механізмам дзеяння і пабочнымі эфектамі. Ідэальны сродак павінен забяспечыць хуткае засынанне, дастатковую працягласць сну і мінімальнае так званае паслядзеянне (санлівасць, прыгнечанне псіхічнай і фізічнай актыўнасці). Пацыентаў з дэпрэсіяй або суіцыдальным мысленнем урач папярэджвае аб магчымасці ўзнікнення падобнага стану або думак.

**Заўсёды трэба памятаць, што працяглае (месяц і болей) прымяненне любых снатворных сродкаў — неразумная і небяспечная практыка.** Звычайна падобныя лекі прапісваюцца курсам на 2 тыдні. Пры вельмі працяглым ужыванні можа развіцца залежнасць, і прэпарат проста перастане аказваць належны эфект.

Ва ўрачэбнай практыцы найбольшай папулярнасцю карыстаецца запіклон («Самнол», «Санекс», «Санат-КМП»), які забяспечвае хуткае засынанне і блізкі да натуральнага па структуры і працягласці сон, даволі хутка выводзіцца з арганізма. Вытворныя запіклону пасля курсавога прыёму могуць аднавіць фізіялагічную структуру сну.

Прымяняюцца і вытворныя залеплону («Андантэ»). Па рэцэпце выпісваюцца бензадыязепіны. З ліку этаналамінаў на беларускім рынку прысутнічаюць «Данарміл» і «Санміл».

Сярод пабочных эфектаў — слабасць раніцай, сухасць у роце, парушэнне адаптацыйных здольнасцяў, парушэнне мочаспускання, запор, павышэнне тэмпературы цела.

Больш працягла можна прымяняць раслінныя прэпараты з седатыўным эфектам: валяр'яну, сардэчнік, пасіфлору і іншыя. Яны не выклікаюць фізічнай залежнасці, але могуць выклікаць эмацыйную.

**СУПРАЦЬПАКАЗАННІ ДЛЯ ЎСІХ СНАТВОРНЫХ:**

- цяжарнасць і лактацыя
- узрост да 15 гадоў
- павышаная адчувальнасць да прэпарату.

Пажылым пацыентам з недастатковай функцыяй печані або нырак прызначаюць палову дозы, паступова павялічваюць яе, а пры адмене прэпарата паступова зніжаюць дозу або павялічваюць час паміж прыёмамі.

Падчас лячэння неабходна пазбягаць ужывання алкаголю, а таксама патэнцыяльна небяспечных відаў дзейнасці, якія патрабуюць павышанай увагі і хуткай рэакцыі, напрыклад, падчас ваджэння аўтамабіля.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Даты | Падзеі | Людзі

**1147** год — першая згадка пра Маскву. Менавіта пад датай 4 красавіка 1147 года ў Іпацьеўскім летапісе гаворыцца аб сустрэчы ў Маскве двух князёў — уладзіміра-суздальскага князя Юрыя Даўгарукага і ноўгарад-северскага князя Святаслава. У той час Масква была невялікім паселішчам на паўднёва-заходніх рубяжах Растова-Суздальскага княства, на скрыжаванні шляхоў, якія ішлі ва Уладзімір, Суздаль і Растоў з Чарнігава і Разані. Падчас мангольскага нашэсця на Русь, у 1238 годзе, горад быў разрабаваны. Але неўзабаве Масква стала цэнтрам барацьбы з Залатой Ардой, а затым і сталіцай Маскоўскай Русі.



**1557** год — нарадзіўся (вёска Астроўна, цяпер Віцебская вобласць) Леў Іванавіч Сапега, дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, дыпламат і мысляр. Атрымаў добрую адукацыю, свабодна валодаў пяццю мовамі. На працягу свайго жыцця Сапега займаў самыя высокія пасады ў ВКЛ. Разам з канцлерам Астафіем Валовічам і Крыштафам Радзівілам удзельнічаў у стварэнні Трыбунала ВКЛ. Узначальваў соймавую камісію па падрыхтоўцы Статута ВКЛ (1588), адрэдагаваў яго тэкст і фінансаваў выданне ў віленскай друкарні Мамонічаў. На царкоўным саборы ў Брэсце ў 1596 г. як каралеўскі камісар выступаў у абарону царкоўнай уніі. Удзельнічаў у падпісанні Дзявулінскага перамір'я (1618). У сваёй палітыцы адстойваў суверэнітэт ВКЛ у складзе федэратыўнай Рэчы Паспалітай. Садзейнічаў развіццю беларускага кнігадрукавання. У Ружанах сабраў вялікую бібліятэку. Увайшоў у гісторыю Беларусі як выдатны дзяржаўны дзеяч і дыпламат. Памёр у 1633 годзе.

**1948** год — нарадзіўся Валянцін Васільевіч Мажароўскі, беларускі вучоны ў галіне прыкладной механікі, доктар тэхнічных навук (1993), прафесар (1994). Аўтар навуковых прац па механіцы дэфармаванага цвёрдага цела, метадах разліку напружана-дэфармаванага стану канструкцый з кампазіцыйных матэрыялаў, рашэнні кантактных краявых задач пры ўзаемадзеянні дэфармуемых цвёрдых цел.

Было сказана

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, пісьменнік, паэт, публіцыст:**

*«Душа чалавека, як той алень каля вод, шукае ісціну».*

**НАРОДЖАНЫЯ 4 красавіка**

**Гэтым людзям неабходна ініцыятыва, каб выказаць сваю яркую індывідуальнасць. Аднак зрэдку атрымліваецца так, што яны не могуць адразу вызначыць для сябе, хто яны на гэтай зямлі і чаго шукаюць у жыцці. Настойлівасць — якасць, неабходная ім для дасягнення поспеху. Нельга забывацца на тое, што гэтыя людзі супрацоўнічаюць з іншымі для здзяйснення сваіх задум. Жыццёва неабходным для іх становіцца наяўнасць вернага спадарожніка жыцця ці сябра, здольнага даць аб'ектыўную і сур'ёзную параду. Залог шчасця для іх — цвярозы рэалізм.**

■ Да ведама

# Судак — пад забаронай

**Каб стварыць спрыяльныя ўмовы для аднаўлення звычайнага судака, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ўстанавіла забарону на аматарскую лоўлю гэтага віду рыбы ва ўсіх рыбалоўных угоддзях краіны ў перыяд з 1 красавіка па 30 мая. Гаворка ідзе пра татальную забарону. Што гэта азначае?**

— У вышэйназваны перыяд, як вядома, дзейнічае забарона на здабычу ўсіх відаў рыб у сувязі з іх веснавым нераставаннем. За выключэннем аматарскага рыбалоўства, калі лавіць рыбу можна: у светлы час сутак з берага адной вудай з адным кручком ці адным спінінгам, аснашчаным штучнай прынадай, з адным адзінарным ці двайным, ці трайным кручком памерам не болей за №10 па міжнароднай класіфікацыі №1. Дык вось, калі ў гэты час, напрыклад, на кручок рыбалова пападзецца шчупак, яго браць можна. А судака трэба абавязкова адпусціць. Дарэчы, такая ж забарона, толькі ў сакавіку, дзейнічала ў дачыненні да шчупака, — патлумачыла «Звяздзе» прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч.

Апроч забароны на лоўлю судака ва ўсіх рыбалоўных угоддзях, таксама ў вышэйназваны перыяд цалкам забараняецца аматарскае рыбалоўства ў месцах масавага нерасту гэтага віду. Напрыклад, у Лунінецкім раёне гэта канал Мікашэвіцкі — на працягу 2,5 кіламетра ўверх па канале ад месца яго ўпадзення ў Прыпяць. У Гродзенскім раёне — на Аўгустоўскім канале ад шлюза каля вёскі Немнава да месца ўпадзення канала ў Нёман, а таксама на шэрагу пойменных вадаёмаў Нёмана. У Магілёве і Магілёўскім раёне — на ўчастку Дняпра і на прылеглых пойменных вадаёмах у межах ад водазабору Магілёўскага аўтамабільнага завода імя С.М. Кірава да вусця ракі Дзебра.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Крымінал, здарэнні

## Абкрадаў шапікі

**У сталіцы міліцыянеры затрымалі 20-гадовага маладога чалавека, які падазраецца ў крадзяжах з кіёскаў.**

— Вызваліўшыся з месцаў пазбаўлення волі, ён заняўся пошукам жылля. Але, не маючы ні працы, ні сродкаў, выбраў звыклы для сябе спосаб «заробку», — распавяла прэс-афіцэр Першамайскага РУУС г. Мінска Святлана Білінская. — Хлопец абсталяваў для сябе жытло ў падвале і пачаў па начах абкрадаць газетныя шапікі, дзе не было сігналізацыі. Ён разбіваў вітрыну і браў усё, што трапляла пад руку: цыгарэты, праязныя білеты, штосьці ядомае. Усяго ад рук падазронага за месяц пацярпелі чатыры кіёскі. Што цікава, у якасці аб'ектаў для крадзяжоў малады чалавек выбіраў толькі тыя, што размяшчаліся паблізу яго імправізаванага жылля. Пры затрыманні ён прызнаў сваю віну. Частка скрадзенага была знойдзена ў падвале, дзе жыў падазраваны.

## Легкавік сутыкнуўся са школьным аўтобусам

**Паведамленне пра дарожна-транспартнае здарэнне ў вёсцы Убалацце Лагойскага раёна паступіла ў службу «101» у 16.15. Патрабавалася дапамога ў выратаванні пацярпелага.**

На месцы работнікі МНС высветлілі, што кіроўца легкавога аўтамабіля «Фольксваген-Пасат» здзейсніў лабавое сутыкненне са школьным аўтобусам «ПАЗ», які рухаўся ў сустрэчным кірунку. Дзяцей у аўтобусе, на шчасце, не было. У выніку аварыі пацярпеў толькі кіроўца легкавіка, якога выратавальнікам давялося даставаць з салона.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 6.35 | 19.51 | 13.16 |
| Віцебск | 6.23 | 19.42 | 13.19 |
| Магілёў | 6.26 | 19.41 | 13.15 |
| Гомель | 6.24 | 19.36 | 13.12 |
| Гродна | 6.51 | 20.05 | 13.14 |
| Брэст | 6.54 | 20.04 | 13.10 |

**Месяц**

*Маладзік 30 сакавіка. Месяц у сузор'і Цяльца.*

**Імяніны**

*Пр. Васіля, Ісака, Паліны. К. Антаніны, Антона, Бенядзікта, Вацлава.*


Фота Алесі ВАРАБ'ЁВАЙ.

## ЗАЎТРА




...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +8..+10°С | КІЕЎ +4..+6°С | РЫГА +7..+9°С |
| ВІЛЬНЮС +5..+7°С | МАСКВА +1..+3°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +5..+7°С |

## УСМІХНЕМСЯ

**Надвор'е быццам пяшчотна шэпча: «Думалі, зімовыя курткі больш не спатрэбяцца, дурненькія?..»**

— Дарагі! Тут сяброўкі ў бар збіраюцца... Можна, я з імі пайшла ўжо?!

**Я сачу за сваёй фігурай... Бо яна па начах ходзіць да халадзільніка.**

Даішнік спыняе машыну дачніка:
— Так, штраф — 50 тысяч рублёў!
— А 100 тысяч не размяняеш?
— А навошта мяняць? Назад жа тут паедзеш?

**У мяне сябар піць кінуў. Ну, як «сябар»... Проста знаёмы.**

— Супакой мяне, дарагі...
— Супакойся.
— Ды ў цябе талент псіхолага!



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 22.011. Індэкс 63850. Зак. № 1300.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 3 красавіка 2014 года.